Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 ЛІПЕНЯ 2015 г. СЕРАДА № 142 (28000) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


■ Ёсць нагода!

28000

## ЯК ЖЫЦЬ — ДЫК ЖЫЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСІ...

Сёння ў нашай хаце свята — як на першы погляд, дык малапрыкметнае, бо на тое, што газета выйшла 29 ліпеня, у сераду, хто-ніхто яшчэ кіне вокам, а вось зглядзець, што нумар гэты, можна сказаць, юбілейны, дваццацівасьмітысячны — наўрад ці: дробны шрыфт. Затое лічба...

Ёй, вось такой, можна пахваліцца! «Звязда» — найстарэйшая з рэспубліканскіх, адзіная са штодзённых беларускамоўная і, бярэмся сцвярджаць, любімая — любімая пакаленнямі (!) яе чытачоў і супрацоўнікаў!

А таму — са святамі нас (9 жніўня «Звяздзе» 98 гадоў!). І будзем разам: газета — як яшчэ адно сведчанне таго, што жыве наша беларуская мова, і мова — як сведчанне таго, што ёсць дзяржава Беларусь, такі народ — беларусы.

**Звяздоўцы.**

# ЦАГЛІНКА ДА ЦАГЛІНКІ

## Айчынная будаўнічая галіна здольная нарасціць экспарт

**Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе аб праблемных пытаннях развіцця прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і шляхах іх вырашэння.**

«Найважнейшая задача цяпер — выгадна прадаць і забяспечыць вяртанне валютнай выручкі ў краіну. Ад гэтага залежыць, ці разлічацца мадэрнізаваныя прадпрыемствы па крэдытах, ці будуць сродкі на развіццё вытворчасці і павышэнне заробкаў работнікам», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для развіцця сферы вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у Беларусі ёсць значныя ўласныя сыравінныя рэсурсы. Ён нагадаў, што для максімальна эфектыўнага выкарыстання гэтага фактару мадэрнізаваны і істотна павялічаны магутнасці айчынных прадпрыемстваў па вытворчасці цэменту і ліставога шкла. Завяршаецца тэхнічнае пераасншчэнне прадпрыемстваў буйнапанэльнага домабудавання і домабудаўнічых камбінатаў.

«Гэта значыць, што ў нас створаны ўмовы не толькі для задавальнення патрэб унутранага рынку, але і для нарошчвання экспарту», — падкрэсліў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, з-за абвастрэння канкурэнцыі, сціскання знешніх рынкаў на першы план выходзяць пытанні якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі.

«Пакуль жа практычна 80% будматэрыялаў, што выпрабляюцца ў краіне, рэалізуюцца на ўнутраным рынку. Прычым мне дакладваюць пра зніжэнне попыту на прадукцыю, пагаршэнне дынамікі вытворчасці ў галіне, нізкую аддачу і неэфектыўнае выкарыстанне дадатковых магутнасцяў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Нам неабходна вызначыць, што ў першую чаргу трэба будзе зрабіць для развіцця галіны, а таксама выпрацаваць сістэмныя падыходы да вырашэння існуючых задач», — сказаў Прэзідэнт. Пры гэтым ён папрасіў не забываць, што гаворка ідзе пра горадаўтваральныя арганізацыі са шматлікімі працоўнымі калектывамі. «Дабрабыт больш як 50 тысяч працоўных і іх сем'яў наўпрост залежыць ад стабільнага функцыянавання гэтых прадпрыемстваў», — нагадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў зніжэння сабекошту будматэрыялаў. Ён падкрэсліў, што змяншаць выдаткі ў галіне варта па ўсіх магчымых напрамках. Зніжэнне сабекошту неабходна для эфектыўных продажаў і канкурэнцыі на рынках сумежных краін.

Як адзначыў міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Чорны, на сённяшні момант ёмістасць рынкаў будаўнічай індустрыі крыху зменшылася, знізілася інвестыцыйная актыўнасць, у тым ліку і ў суседніх з Беларуссю краінах. У Беларусі маецца прафіцыт магутнасцяў.

У гэтай сувязі ўрад звярнуўся да Прэзідэнта з просьбай аказання дзяржаўнай падтрымкі, у прыватнасці, прадпрыемствам цэментнай і шкляной прамысловасці. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што асноўным крытэрыем для аказання фінансавай падтрымкі гэтым прадпрыемствам з'яўляецца максімальнае зніжэнне сабекошту. Толькі калі будуць паказаны вынікі па гэтым параметры, дапушчальна будзе гаварыць пра разгляд пытання магчымай дзяржпадтрымкі гэтых прадпрыемстваў.

У час нарады Прэзідэнт звярнуў увагу таксама на неабходнасць абароны ўнутранага рынку, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

■ Спецыяльны рэпартаж

# Абярэг на ўраджай

**Як толькі колас дасягнуў поўнай спеласці, механізаваны хлебаўборачны атрад, не марудзячы, выйшаў на жніўныя палі. Спачатку за вёскай Падляддзе шэсць камбайнерскіх экіпажаў малацілі азімую пшаніцу. Яшчэ чатыры энерганасычаныя камбайны ўбіралі пшаніцу каля вёскі Ленінск. Падрыхтаваныя для ўборачнай кампаніі вялікааб'ёмныя «МАЗы» пачалі адвозіць з палёў першае збожжа новага ўраджаю. За тры дні, якія, на жаль, не абышліся без дажджоў, на пляцоўку каля КЗС у вёсцы Дудзічы было транспартавана амаль паўтары тысячы тон спелага збожжа. Так пачалося жніво-2015 у сельскагаспадарскім прадпрыемстве «Агра-Абярэг» Пухавіцкага раёна.**

СТАР. 3





Механізатар Аляксандр ВЕРАСОВІЧ рыхтуе камбайн да выезду.



Вадзіцель машыны-кухні Іван БІЛЕЙЧЫК дапамагае камбайнеру Сяргею ДУЛІКУ памыцца пасля нялёгкай працы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:**

*«У сучасных умовах у любой дзяржаве высокая культура з'яўляецца стратэгічным рэсурсам, і беларуская армія была і застаецца аддана ёй. Таму цалкам заканамерна, што ва Узброеных Сілах сёння эфектыўна працуюць вайсковыя ўстановы культуры, у тым ліку Драматычны тэатр беларускай арміі, акадэмічны ансамбль песні і танца, ваенна-мастацкая студыя пісьменнікаў. Рэалізуюцца шматлікія сацыякультурныя праекты — напрыклад, штогадовы фестываль армейскай песні «Зорка», і іншыя».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.07.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15200,00 | ▲ |
| Еўра | 16795,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 251,67 | ▼ |
| Укр. грыўня | 688,25 | ▲ |

<u>Наталля КАЧАНАВА:</u>

# «УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ НЕ ДАЕ НІЯКІХ ШАНЦАЎ АХВОТНЫМ ТРАПІЦЬ У ВНУ З «ЧОРНАГА» ХОДУ»

**Уступныя іспыты — кампанія выключна важнага сацыяльнага гучання, паколькі яе правядзенне і вынікі закранаюць інтарэсы абітурыентаў і іх бацькоў, сваякоў, выкладчыкаў, устаноў адукацыі і г.д. — практычна ўсяго грамадства. Гэта не толькі праверка ведаў і ўменняў абітурыентаў, не толькі індыкатар якасці навучання, але і фактычна дзяржаўны экзамен на справядлівасць, які здае ўлада, — у першую чаргу перад юнымі грамадзянамі, што ўступаюць у дарослае жыццё. Пра тое, як арганізавана ўступная кампанія і што мае патрэбу ў карэкціроўцы, якія звароты паступаюць ад абітурыентаў і іх бацькоў, якім будзе кошт платнага навучання ў новым навучальным годзе, у інтэрв'ю карэспандэнту БЕЛТА расказала віцэ-прэм'ер, старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ўступнымі іспытамі 2015 года Наталля КАЧАНАВА.**



Фота БЕЛТА.

***— Наталля Іванаўна, на першым пасяджэнні дзяржкамісіі па кантролі за ўступнымі іспытамі 2015 года вы паставілі задачу так арганізаваць работу, каб не даць ніякіх шанцаў ахвотным трапіць у ВНУ з чорнага ходу. Ці можна сказаць, што гэта ўдалося зрабіць?***

— У Беларусі скончыўся этап цэнтралізаванага тэсціравання, завяршыўся прыём дакументаў для паступлення ў ВНУ на бюджэт на дзённую і завочную формы навучання (за выключэннем завочнай формы ў сельскагаспадарчыя ВНУ), ідзе прыём дакументаў на платную форму навучання, ва ўстановах вышэйшай адукацыі праводзяцца ўступныя іспыты на спецыяльнасці, на якіх прадугледжаны экзамены па творчасці, фізічнай культуры і літаратуры, а таксама для выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія паступаюць на скарочаны тэрмін навучання.

Па выніках першага этапу ўступнай кампаніі магу з упэўненасцю сказаць: атрымаць студэнцкі білет без трывалых ведаў у абыход закону ніхто не зможа. І спадзяюся, што змагу гэта паўтарыць пасля завяршэння ўсіх этапаў кампаніі.

Асноўнай задачай камісіі з'яўляецца кантроль за прадастаўленнем абітурыентам аднолькавых магчымасцяў пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэспублікі. Гэта задача выконваецца на самым высокім узроўні, камісіі па кантролі за ходам уступных іспытаў працуюць зладжана і дакладна, у адпаведнасці з ускладзенымі на іх функцыямі. Я асабіста пераканалася ў гэтым, наведваючы ўніверсітэты, дзе праходзіла цэнтралізаванае тэсціраванне. Дарэчы, зваротаў у дзяржкамісію ад абітурыентаў і бацькоў па пытанні арганізацыі ЦТ не паступала.

***— За апошнія пяць гадоў не было выяўлена фактаў карупцыі пры паступленні ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Гэта ўступная кампанія не стане выключэннем?***

— На цяперашнім этапе ніводнага такога факта не выяўлена. Уступная кампанія праходзіць у поўнай адпаведнасці з устаноўленым парадкам. Хачу запэўніць, што працэдура залічэння на навучанне будзе такой жа дэмакратычнай і публічнай, як і папярэднія этапы кампаніі.

СТАР. 2

## НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ» — МІНІСТР ПА НАДЗВЫЧАЙНЫХ СІТУАЦЫЯХ

З дапамогай чаго ўдалося знізіць колькасць загінулых на пажарах да мінімуму за апошнія 15 гадоў? Як МНС плануе вырашыць праблему абмежаванага доступу да шматпавярховых дамоў з-за запаркаваных двароў? На што будзе звернута ўвага пры падрыхтоўцы да чарговага ацяпляльнага сезона?

Атрымаць адказы на гэтыя пытанні і задаць свае **міністру па надзвычайных сітуацыях Уладзіміру Аляксандравічу ВАШЧАНКУ** можна будзе **30 ліпеня** (дата правядзення змянілася) падчас «прамой лініі» ў газеце «Звязда», якая пройдзе **з 11 да 12 гадзін.** Тэлефануйце ў гэты час па нумары **(017) 287 18 71.**

Папярэдне пытанні можна пакінуць па нумары **(017) 292 38 02** ці даслаць іх на паштовую скрыню *schklennik@zviazda.by*

■ Ураджай-2015

## УБРАЛІ ПЯТУЮ ЧАСТКУ ПАСЕЯНАГА

**Паводле інфармацыі Мінсельгасхарча, па стане на 28 ліпеня беларускія аграрыі намалацілі больш як 1,4 млн тон збожжа. Усяго ж пакуль збожжа і зернебабовыя культуры ўбраны з 439 тыс. га пасяўных плошчаў, што прыблізна складае 19,5% ад плана.**

Ураджайнасць на палях Беларусі зараз каля 32,1 ц/га, што крыху менш, чым летась (39,4 ц/га). Больш за ўсё збожжа намалацілі ў Брэсцкай вобласці — 433,7 тыс. тон на 33,8% пасяўных плошчаў. Далей ідзе Гомельская вобласць, дзе сабралі 422,3 тыс. тон (убрана 52,6% збожжа з пасяўных плошчаў). У Мінскай вобласці намалацілі 216,6 тыс. тон, у Магілёўскай — 178 тысяч, у Гродзенскай — 136,7, а ў Віцебскай вобласці пакуль толькі 21 тысячу тон збожжа. Уборка працягваецца, нягледзячы на ўмовы надвор'я.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Украіна паставіць войска пад чатырохканцовыя зоркі?



Ва Украіне адбылася прэзентацыя новай ваеннай формы. Асноўнымі зменамі сталі новыя колеры і камуфляж формы розных відаў войскаў, а таксама замена пяціканцовай зоркі на чатырохканцовую. Большая частка кампанентаў формы выраблена ва Украіне. «У новай форме адмовіліся ад пяціканцовай зоркі і вярнуліся да чатырохканцовай, якая выкарыстоўвалася Украінскай Галіцкай арміяй. Таксама ўведзены асобны колер кіцеля для спецвойскаў», — паведамілі ў Савеце нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны. Юрыдычна ўзоры зацверджаны пакуль не былі.

### Кэмеран даў шатландцам пяць гадоў падумаць аб незалежнасці




Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран выключыў магчымасць правядзення паўторнага рэферэндуму аб незалежнасці Шатландыі да ўсеагульных выбараў 2020 года, перадае The Telegraph. З ініцыятывай аб правядзенні другога плебісцыту да кіраўніка брытанскага ўрада звярнулася лідар Шатландскай нацыянальнай партыі Нікола Стэрджэн, які ў красавіку гэтага года паабяцаў шатландцам правесці другі рэферэндум аб незалежнасці ў выпадку, калі Брытанія выйдзе з Еўрасаюза ў 2017 годзе. Галасаванне па пытанні аб незалежнасці Шатландыі адбылося 18 верасня 2014-га. Каля 55 працэнтаў удзельнікаў рэферэндуму выказаліся за захаванне краіны ў складзе Злучанага Каралеўства. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран абавязаўся пашырыць паўнамоцтвы Шатландыі.

### Сына Кадафі прысудзілі да расстрэлу

Сын Муамара Кадафі Сэйф аль-Іслам прысуджаны да расстрэлу. Пра гэта паведамляе тэлеканал «Аль-Джазіра». Крымінальны суд Лівіі прызнаў васьмярых высокапастаўленых функцыянераў рэжыму Кадафі вінаватымі ў ваенных злачынствах, учыненых пры спробе задушыць паўстанне 2011 года. Акрамя сына Муамара Кадафі, сярод асуджаных — былы прэм'ер-міністр краіны Аль-Багдадзі аль-Махмудзі і кіраўнік разведкі Абдала ас-Сінусі. Сам Сэйф аль-Іслам на працэсе не прысутнічаў, паказанні ён даваў па Skype. Зараз яго ўтрымлівае адна з груповак былых паўстанцаў у горадзе Зінтан, якія знаходзяцца ў апазіцыі цяперашнім уладам Лівіі і адмаўляюцца выдаць ім палоннага.

ISSN 1990 - 763X

15142>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Медыкі склалі спіс самых карысных напояў у свеце

Наяўнасць у рацыёне пэўных напояў дазваляе амаладзіць і аздаравіць арганізм, высветлілі спецыялісты. Самым карысным быў прызнаны чай, перадае Comandir. Найбольш эфектыўным навукоўцы палічылі белы чай. На другім месцы стаіць зялёны. Чым менш ферментацыі перанёс чай, тым ён больш карысны за кошт ўтрымання вялікай колькасці поліфенолаў. Далей ідзе каркадэ. Ён робіцца з расліны Hibiscus sabdariffa, якая змяшчае антацыяны. У каркадэ ёсць вітамін P, які ўмацоўвае сценкі крывяносных сасудаў. Кава апынулася на трэцім месцы. Яна блакуе работу шэрагу сігнальных шляхоў, тым самым падымаючы настрой, павялічваючы прадукцыйнасць пры стоме, увагу, паляпшаючы памяць. У сваю чаргу, какава не дае склейвацца трамбацытам, пазітыўна ўплывае на сасудзісты статус. Таматны сок — пяты пункт — паляпшае зрок. На шостым месцы адвар шыпшыны, багаты на вітамін С. На апошнім месцы ў спісе карысных напояў размясцілася чырвонае віно, якое ўмацоўвае імунітэт.

КОРАТКА

**Урад Беларусі прадаставіць адкрытаму акцыянернаму таварыству «БПБ-Ашчадбанк» гарантыі ў пагашэнні крэдытаў ААТ «Мінскі трактарны завод» і «БелАЗ» — кіруючая кампанія холдынга «БелАЗ-Холдынг».**

Мінспорту і турызму рэкамендуе беларусам не наведваць паўднёвы ўсход Турцыі.

**У эканоміцы краіны ў чэрвені гэтага года былі заняты 4 млн 467,6 тыс. чалавек. Гэта на 1,5 працэнта менш, чым у чэрвені мінулага года.**

Жараб'ёўка выступленняў удзельнікаў нацыянальнага адбору дзіцячага «Еўрабачання-2015» на фінальным гала-канцэрце пройдзе 1 жніўня ў Белтэлерадыёкампаніі. У гэты ж дзень адбудзецца запіс відэавізітак юных выканаўцаў.

**31 ліпеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрыецца выстава, дзе будуць паказаны 23 работы з залатога фонду сучаснага мастацтва Кітая, якія атрымалі прэміі на 12-й Усекітайскай выстаўцы мастацкіх твораў. Убачыць іх можна будзе да 10 жніўня.**

■ Выбары-2015

# ЗРАБІЦЬ СВЯДОМЫ ВЫБАР

## Як праходзіць збор подпісаў на вуліцах сталіцы

**Ініцыятыўныя групы васьмі прэтэндэнтаў на вышэйшую дзяржаўную пасаду разгарнулі свае пікеты на вуліцах гарадоў. Для рэгістрацыі кандыдата неабходна сабраць не менш за 100 тысяч подпісаў. Кожны грамадзянін можа падпісацца за рэгістрацыю адразу некалькіх прэтэндэнтаў, але пры гэтым ён не мае права пакідаць свой подпіс за аднаго і таго ж чалавека больш за адзін раз.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Карэспандэнты «Звязды» наведалі некалькі асабліва шматлюдных месцаў сталіцы і пацікавіліся ў членаў ініцыятыўных груп, наколькі ахвотна людзі пакідаюць свае подпісы.

### ПАДЗЕЯ І ДЛЯ МАЛАДЫХ, І ДЛЯ СТАЛЫХ

Ля ўніверсама «Цэнтральны» пікеты разгарнулі ініцыятыўныя групы некалькіх прэтэндэнтаў на пост Прэзідэнта.

Яўген Рыбакоў, член ініцыятыўнай групы Таццяны Караткевіч, прызнаецца, што для яго важна, каб на выбарах было некалькі кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта.

— Свае подпісы пакідаюць людзі розных узростаў, — адзначае ён. — Я заўсёды ў гутарцы з мінакамі звяртаю ўвагу на тое, што кожны мае права пакінуць свой подпіс на карысць адразу некалькіх прэтэндэнтаў.

СТАР. 2

# ЗРАБІЦЬ СВЯДОМЫ ВЫБАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яго «калега» — малады ўсмешлівы хлопец Вячаслаў з ініцыятыўнай групы Віктара Цярэшчанкі — ахвотна дзеліцца сваімі сённяшнімі назіраннямі.

— Людзі падыходзяць, задаюць пытанні: нехта хоча даведацца пра нашага прэтэндэнта літаральна ўсё. Нехта, у каго не так шмат часу, каб чытаць біяграфію, падыходзіць і просіць расказаць у двух словах; ёсць людзі, якія проста падыходзяць і пакідаюць свой подпіс.

Ля пікета, устаноўленага ініцыятыўнай групай Аляксандра Лукашэнкі, спыняецца мужчына і дае жанчынам свой пашпарт, каб тыя ўнеслі яго голас у падпісны ліст.

Пакуль яго звесткі ўносяць у спіс, тлумачыць, чаму ён падпісваецца за перавыбранне цяперашняга Прэзідэнта.

— У нас спакойна, бяспечна — гэта на сённяшні дзень галоўнае.

Алена Дашкевіч, член ініцыятыўнай групы Аляксандра Лукашэнкі, унёсшы неабходную інфармацыю ў спіс, ахвотна адказвае на мае пытанні.

— Людзі падыходзяць, пакідаюць свае подпісы, — дзеліцца назіраннямі жанчына. — Што радуе, падпісваецца і шмат моладзі. Многія кажуць, што гатовы прагаласаваць зараз жа. Часта падыходзяць замежнікі, якія таксама хочуць пакінуць свой подпіс за нашага Прэзідэнта. Праўда, законам гэта забаронена, таму ім дзякуем і адмаўляем.

**«Нехта хоча даведацца пра нашага прэтэндэнта літаральна ўсё. Нехта, у каго не так шмат часу, каб чытаць біяграфію, падыходзіць і просіць расказаць у двух словах».**





Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ДАВЕДАЦЦА ПРА ЎСІХ ПРЭТЭНДЭНТАЎ

Пікеты ля ГУМа таксама карыстаюцца папулярнасцю ў мінакоў — ля кожнага спыняюцца, чытаюць біяграфіі прэтэндэнтаў, гутараць з прадстаўнікамі ініцыятыўных груп.

Вікторыя, член ініцыятыўнай групы Віктара Цярэшчанкі, заўважае, што сёння за яе прэтэндэнта пакідаюць свае подпісы ў асноўным людзі больш сталага ўзросту. Пытанні таксама задаюць вельмі актыўна.

**«Што радуе, падпісваецца і шмат моладзі. Многія кажуць, што гатовы прагаласаваць зараз жа. Часта падыходзяць замежнікі, якія таксама хочуць пакінуць свой подпіс».**

— Цікавяцца, напрыклад, чым займаецца Віктар Цярэшчанка зараз, ці з'яўляецца ён членам якой-небудзь партыі. Некаторых трошкі бянтэжыць узрост прэтэндэнта — яму ўжо 65 гадоў.

Ігар Мікалаевіч збірае подпісы за Аляксандра Лукашэнку. Мужчына канстатуе: прахожыя цікавяцца выбарчай кампаніяй.

— Звычайна шмат пытанняў мне не задаюць — дзейнага Прэзідэнта ўсе ведаюць. Таму ахвотныя проста падыходзяць і пакідаюць свой подпіс.

Ля пікета ініцыятыўнай групы Таццяны Караткевіч будаўнік Сяргей расказаў, што гэта першая з прэтэндэнтаў на пост Прэзідэнта, за якую ён сёлета падпісаўся.

— Але думаю пачытаць і пра іншых — можа, падпішуся за каго-небудзь яшчэ, — прызнаецца ён.

## ПАТРЭБНА КАНКУРЭНЦЫЯ

Настасся, член ініцыятыўнай групы Сяргея Гайдукевіча, заўважае, што людзі падыходзяць паставіць свой подпіс самі — ніхто іх спецыяльна не зазывае.

— Чалавек сам можа зрабіць выбар. Калі нешта незразумела пра кандыдата, мы тлумачым. У асноўным свае подпісы пакідаюць людзі сярэдняга ўзросту.

Маладая жанчына Наталля, якая толькі што пакінула свой подпіс, прызналася, што хоча, каб выбары прайшлі ва ўмовах канкурэнцыі.

За той час, пакуль я гутарыла з прадстаўнікамі ініцыятыўных груп і прахожымі, ніводзін пікет не заставаўся незапатрабаваным — ля кожнага стаялі людзі: дзяліліся сваімі думкамі, здагадкамі. Адразу відаць — мінчане займаюць актыўную грамадзянскую пазіцыю і хочуць зрабіць свой выбар свядома.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ГАЛОЎНАЕ — НЕ СКРЫНІ, А ТОЕ, ШТО Ў ІХ

**Празрыстыя скрыні — усяго толькі модная фішка, якая ніяк не ўплывае на ход галасавання. Пра гэта ўчора заявіла журналістам старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА перад пачаткам семінара па арганізацыі і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Мінскім аблвыканкаме.**

Кажучы пра эфектыўнасць выкарыстання празрыстых скрынь для галасавання, кіраўнік ЦВК адзначыла, што гэта ўсяго толькі іміджавыя моманты, якія не ўплываюць на вынікі выбараў. «Увесь свет думае пра перспектывы электроннага галасавання, таму празрыстыя скрыні — гэта ўсяго толькі модная фішка, распаўсюджаная толькі ў краінах былога СССР, — падкрэсліла яна. Прычым не ў тых краінах, якія ўступілі ў Еўрасаюз, а ў тых, якія спрабуюць даказаць, што ў іх усё дэмакратычна і добра. Галоўнае — не скрыні для галасавання, а тое, што ў іх знаходзіцца, гэта значыць бюлетэні з пэўным волевыяўленнем».

Аналагічную думку Лідзія Ярмошына выказала і ў дачыненні да сучасных сродкаў відэаназірання, якімі абсталяваны некаторыя выбарчыя ўчасткі. «Дзе-нідзе ў нас яны маюцца, але зноў жа, усё гэта падобна да празрыстых урнаў. Запісы з відэакамер пасля нават не могуць служыць доказам празрыстасці выбараў. Відэакамеры даюць агульны план і фіксуюць толькі відавочныя парушэнні. Таму ўспрымаць празрыстыя скрыні і відэакамеры як панацэю немэтазгодна, да таго ж гэта яшчэ і дорага», — адзначыла яна. Так, адна празрыстая скрыня каштуе каля $100, а на кожным выбарчым участку павінна быць 5 скрыняў для галасавання, з якіх 3 пераносныя і 2 стацыянарныя.

Па словах Лідзіі Ярмошынай, у краіне празрыстыя скрыні ўсталёўваюць там, дзе мясцовыя ўлады знайшлі на гэта сродкі. Напрыклад, у Мінскай вобласці імі будуць забяспечаны 12% выбарчых участкаў, у Віцебскай вобласці — 70%.

Кіраўнік ЦВК таксама паведаміла журналістам, што збор подпісаў у падтрымку патэнцыйных кандыдатаў у прэзідэнты праходзіць без парушэнняў. У Мінскай вобласці працуюць каля сотні пікетаў.

■ Блізкая ўлада

# АБЫ ЗАПЫТАЦЦА?

## Ад штатных скаржнікаў церпяць іншыя, каму сапраўды патрэбна дапамога

**Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», які прадугледжвае адказнасць за неабгрунтаваныя звароты, падпісаны. Але да таго, як ён уступіць у сілу, у насельніцтва яшчэ ёсць час разабрацца, што маецца на ўвазе. Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала высветліць, якія пытанні можна аднесці да неабгрунтаваных і ці шмат іх паступае ў органы дзяржаўнай улады.**

Сёлета насельніцтва атрымала яшчэ адну магчымасць наўпрост паразмаўляць з мясцовай уладай. Кожную суботу з 9 да 12 гадзін у рай- і аблвыканкамах працуюць «прамыя лініі». Ахвотнікаў патэлефанаваць больш чым хапае. Апошняя «лінія» ў Магілёўскім аблвыканкаме не выключэнне. Роўна ў 9.00 гучыць першы званок. На сувязі з народам **старшыня аблсавета дэпутатаў Анатоль ІСАЧАНКА**, яму дапамагае больш як 10 адказных за розныя сферы дзейнасці асоб. Каб чалавек змог адразу атрымаць поўную кансультацыю па сваім пытанні.

Жанчына занепакоеная тым, што з сацыяльнага пакета выкраслены канал «Саюз». Ад імя праваслаўных вернікаў яна просіць ліквідаваць несправядлівасць. Пасля яе тэлефануе жанчына са скаргай, што ў ліфце адарвалася планка, а начальнік ЖЭУ не можа знайсці шрубу, каб яе замацаваць, — спасылаецца на адсутнасць грошай. Наступны грамадзянін не жадае пераплачваць за вываз смецця і нават хацеў бы пазбавіцца ад гэтай паслугі. Яшчэ адзін мужчына скардзіцца на неабгрунтаванае звальненне. Упэўнены, што алкатэстар, у які яму далі дыхнуць, быў няспраўны і памылкова паказаў больш за 2 праміле... Тэлефон не змаўкае ўсе 3 гадзіны. Васьмідзесяцігадовы жыхар з Асіповіцкага раёна заказаў паліва, але, каб прывезці яго, павінен заплаціць амаль... паўтара мільёна рублёў. Менавіта ў такую суму ацэньваюць пастаўшчыкі дастаўку грузу на адлегласць 40 кіламетраў. Кажуць, інакш гэта не рэнтабельна. Жанчына з Быхаўскага раёна паскардзілася на адсутнасць у вёсцы інтэрнэту. Яна набыла «Трыджык», але ён не працуе... З Брэсцкай вобласці патэлефанавалі ў спадзяванні, што ім дапамогуць вярнуць грошы за агуркі, якія яны здалі летась аднаму з асіповіцкіх прыёмшчыкаў. Доўг у 56 мільёнаў вісіць ужо амаль год. Не дапамаглі нават звароты ў рэспубліканскую Федэрацыю прафсаюзаў. Адказ адзін: чакайце, пакуль праблема са сродкамі. Малады спецыяліст, які прыехаў па размеркаванні ў Слаўгарадскі раён, паведаміў, што ўжо два месяцы змагаецца, каб яму выдзелілі пакой у інтэрнаце. Скардзіліся таксама на адсутнасць аптэкі, затрымкі з заробкамі, разбітыя дарогі. Прасілі пасадзейнічаць у ліквідацыі будаўнічых недапрацовак, правядзенні добраўпарадкавання, узвядзенні станцыі абезжалезвання. Усяго набалелым непасрэдна са старшынёй аблсавета падзяліліся 32 жыхары вобласці, яшчэ 23 скаргі выслухалі спецыялісты. А наогул было зарэгістравана 3 тысячы спроб патэлефанаваць.

— На гэты раз амаль не было неабгрунтаваных зваротаў, — падвёў вынікі дзяжурства Анатоль Ісачанка. — Асабліва звяртаеш увагу на, так мовіць, сістэмныя пытанні, якія хвалююць не толькі таго, хто тэлефануе, а вялікую колькасць людзей. Асабістыя праблемы таксама трэба вырашаць, але калі чалавек задае пытанні па вадзе, рамонце вуліцы, адкрыцці аптэкі, гэта датычыцца ўсяго насельніцтва, якое жыве на гэтай тэрыторыі.

Але калі падзяляць пытанні, якія паступаюць на «прамыя лініі» ў цэлым, то прыкладна 20% з іх наогул пустыя. А з тых, якія можна вырашыць на месцах, працэнтаў 70 і нават больш. З імі зусім не трэба выходзіць на ўзровень вобласці ці рэспублікі. Тыя змены, якія ўнесены ў Закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асобаў», дапамогуць навесці парадак, бо больш адказна будуць ставіцца не толькі грамадзяне, але і афіцыйныя асобы, да якіх яны звяртаюцца. Адказ на зварот таксама павінен быць абгрунтаваны. Ёсць, безумоўна, пытанні, якія раён не можа самастойна вырашыць: тая ж газіфікацыя, падвод дарог. Але мясцовая ўлада сама можа ўзнімаць гэтую праблему перад вышэйшай. Што датычыцца грамадзян, то яны таксама павінны разумець, што калі па іх пытанню ўжо дадзены поўны адказ, не трэба зноў і зноў яго агучваць. А то бываюць выпадкі, калі ў адказе пазначана канкрэтная дата вырашэння праблемы, а чалавек нават не лічыць патрэбным пачакаць.

**Начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Горацкага райвыканкама Наталля ШАПАРАВА** ўзгадала два яскравыя прыклады, калі людзі злоўжывалі сваім правам. Адна жанчына на працягу апошніх 30 гадоў скардзіцца на тое, што яе зямельны ўчастак падтопліваюць суседзі. «Колькі разоў мы ні выязджалі, факт не пацвердзіўся, — кажа Наталля Валер'еўна. — Суседзі ж, каб жанчына не скардзілася, нават водаадводы пабудавалі, але яна ўсё роўна нам тэлефануе». Яшчэ адна жанчына не згодна з тым, што яе звольнілі з працы. Яна звярталася ва ўсе інстанцыі і нават Вярхоўны Суд. Але ніхто не ўгледзеў у дзеяннях наймальніка нейкіх парушэнняў. Жанчына ж працягвае «ваяваць». А замест таго, каб займацца яе беспадстаўнымі скаргамі, маглі б дапамагчы іншаму чалавеку, які сапраўды мае ў гэтым патрэбу.

— Што датычыцца паўторных зваротаў, то ў нас іх не вельмі шмат, — кажа Наталля Шапарава. — Некаторыя пастаянна звяртаюцца да нас з рознымі праблемамі, але гэта людзі, якія лічаць сябе так званымі інспектарамі ад народа. Яны звычайна вырашаюць пытанні, якія датычацца вялікай колькасці людзей і, зразумела, дазваляюць і ім нешта для сябе палепшыць.

Тое, што людзі сігналізуюць аб праблемах, добра. Напрыклад, пасля звароту на тэлефонную лінію ў Чавускі райвыканкам была зроблена паркоўка з прыцягненнем асабістых сродкаў гараджан. Але ж хапае і іншых выпадкаў.

— Як паказаў аналіз, з пачатку года каля 25-30% зваротаў па вобласці былі неабгрунтаванымі, — кажа **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Магілёўскага аблвыканкама Іна ФІЛІПАВА**. — У кожным раёне ёсць людзі, якія пішуць і тэлефануюць па адных і тых жа праблемах. Гэта розныя пытанні, у тым ліку тыя, якія датычацца маёмасных спрэчак. Праводзіцца праверка, даюцца адказы, але зноў і зноў паступаюць звароты з тым жа пытаннем. Мы спыняем перапіску, бо ніякіх новых адказаў даць не можам, але бескарысна. У нас ёсць выпадак, калі чалавек за паўгода напісаў 30 зваротаў па розных пытаннях. Мы праверылі ўсё, але ніводзін факт не пацвердзіўся. Ёсць асобы, якія імкнуцца ціснуць на ўладу, дабіцца свайго любой цаной, ігнаруючы нават існуючае заканадаўства і інтарэсы іншых грамадзян. Мы збіраемся больш дэталёва аналізаваць кожны зварот і рабіць высновы. Некаторым «штатным» скаржнікам не перашкодзіць астудзіць запал.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

# «УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ НЕ ДАЕ НІЯКІХ ШАНЦАЎ АХВОТНЫМ ТРАПІЦЬ У ВНУ З «ЧОРНАГА» ХОДУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Як вы ацэньваеце створаны ў Беларусі механізм фарміравання студэнцкай аўдыторыі, ці мае патрэбу ён у далейшым удасканаленні?***

— Упэўнена: ідэальнай сістэмы адукацыі, таксама як і ідэальнага механізма прыёму на навучанне, няма ні ў адной дзяржаве свету, таму ўдасканаленне — заканамерны працэс для любой краіны. Пытанне ў тым, што рабіць гэта трэба прадумана, паэтапна, з улікам сусветнага вопыту і нацыянальных асаблівасцяў.

Пры правядзенні сустрэч з педагагічнымі работнікамі запрашаю іх да шчырай размовы аб тым, якія ў іх ёсць пытанні, прапановы, пажаданні па ўдасканаленні сістэмы адукацыі. Шэраг важных і цікавых прапаноў будзе разгледжаны ў ходзе дапрацоўкі праекта закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (плануецца прадставіць у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў снежні бягучага года. — **Заўвага БЕЛТА**).

Што датычыцца вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання, то ўдзел у ім прынялі 99 тыс. 177 чалавек. Традыцыйна задаюць пытанне, колькі сярод іх замежных грамадзян. Гэта не сакрэт: ЦТ здавалі 599 іншаземцаў, з якіх 435 чалавек маюць пасведчанне на права жыхарства ў Беларусі, 164 прад'явілі пашпарт замежнага грамадзяніна (у тым ліку 112 — расійскі). Сярод тых, хто здаваў ЦТ, 47,42% скончылі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі і 19,23% — установы сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі ў 2015 годзе, 33,27% — выпускнікі навучальных устаноў мінулых гадоў.

За парушэнні — пераважна наяўнасць мабільных тэлефонаў у аўдыторыі — не допушчаны да праходжання ЦТ 12 чалавек (летась — 25). І прычына — не няўважлівасць або няпамятлівасць абітурыентаў, бо іх неаднаразова папярэджвалі перад пачаткам ЦТ па кожным прадмеце. Крыўдна, што з-за гэтага хлопцы і дзяўчаты пазбавіліся права паступлення сёлета, але спадзяюся, што яны атрымаюць з гэтага ўрок на будучыню.

Па медыцынскіх паказаннях тэсціраванне не прайшлі 12 абітурыентаў. Ім была дадзена магчымасць здаць ЦТ у рэзервовы дзень.

Радуе, што колькасць абсалютных вынікаў — 100 балаў — сёлета 277, а гэта больш як у 2 разы перасягае леташнюю (122). Прычым 11 абітурыентаў атрымалі максімальныя вынікі па 2 прадметах.

***— Калі пагаварылі ўжо пра выдатнікаў, то лагічна прывесці лічбы і па нездавальняючых адзнаках.***

— Не пераадолелі парог па рускай і беларускай мовах, устаноўлены для ўдзелу ў конкурсе пры паступленні ў ВНУ, 7 тыс. 770 чалавек. Тэставы бал, ніжэйшы за неабходны для ўдзелу ў конкурсным адборы па рускай і беларускай мовах і першым профільным прадмеце, маюць 35 тыс. 205 абітурыентаў, у тым ліку 2 тыс. 31 абітурыент не пераадолелі парогавага значэння адначасова па трох навучальных прадметах, 10 тыс. 572 — па двух, 22 тыс. 602 — па адным навучальным прадмеце. Тэставы бал, ніжэйшы за неабходны для ўдзелу ў конкурсным адборы ў ВНУ па рускай і беларускай мовах і другім профільным прадмеце, маюць 20 тыс. 274 абітурыенты, у тым ліку 539 абітурыентаў не пераадолелі парогавага значэння адначасова па трох навучальных прадметах, 3 тыс. 738 — па двух, 15 тыс. 997 — па адным навучальным прадмеце. У 237 выпадках абітурыенты па выніках выканання тэстаў атрымалі 0 балаў, у тым ліку 225 чалавек — па адным навучальным прадмеце, 6 абітурыентаў — па двух навучальных прадметах.

Пры гэтым, падкрэслю, ЦТ здалі ў цэлым лепш, чым летась.

***— Ці ёсць інфармацыя аб тым, выпускнікі якіх тыпаў устаноў адукацыі прадэманстравалі на ЦТ больш моцныя веды?***

— Як паказвае аналіз, найлепшы сярэдні бал — у выпускнікоў гімназій і ліцэяў, на наступнай пазіцыі — выпускнікі сярэдніх агульнаадукацыйных школ, потым — выпускнікі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і выпускнікі мінулых гадоў. Неабходна адзначыць, што профільнае навучанне, якое ўводзіцца ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, дасць магчымасць павысіць якасць падрыхтоўкі і, вядома, выніковасць цэнтралізаванага тэсціравання.

***— Цэнтралізаванае тэсціраванне як форма правядзення ўступных іспытаў ужо даказала сваю аб'ектыўнасць, хоць падабаецца не ўсім абітурыентам і бацькам. Якое ваша стаўленне да ЦТ?***

— На мой погляд, цэнтралізаванае тэсціраванне з'яўляецца аб'ектыўнай формай праверкі ведаў: усе абітурыенты знаходзяцца ў роўных умовах, механізм дзеянняў адпрацаваны, вызначаны дакладныя правілы гульні. Гэтая сістэма ацэнкі ведаў выключае любыя карупцыйныя з'явы і суб'ектыўныя перакосы.

***— Але пры гэтым пастаянна даводзіцца чуць, што ЦТ здаць на высокі бал немагчыма без заняткаў з рэпетытарам. Зразумела, што не ў кожнай сям'і ёсць грошы для аплаты іх паслуг. Атрымліваецца, што абітурыенты маюць усё-такі розныя стартавыя пазіцыі: у адных за плячамі толькі школьная праграма, у другіх — аплачанае бацькамі рэпетытарства.***

— Гэта пытанне вельмі злабадзённае. Я неаднаразова абмяркоўвала яго на сустрэчах з работнікамі сферы адукацыі і пераканана, што калі ў школе добрыя педагогі-прадметнікі, то рэпетытары не патрэбны. Рэпетытар у большай ступені арыентаваны на падрыхтоўку да ЦТ, у той час як сапраўдны школьны настаўнік імкнецца даць вучням веды. І мы бачым гэта па выніках праведзенага ЦТ: у школах, дзе, напрыклад, добры настаўнік па фізіцы, ёсць і пераможцы, і ўдзельнікі прадметных алімпіяд, і выпускнікі са 100 баламі ў сертыфікаце, і вялікі працэнт тых, хто паступае ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Дарэчы, сёлета даволі хутка ўкамплектаваліся педагагічныя ВНУ. Сярод тых, хто падаў дакументы, шмат медалістаў, хлопцаў і дзяўчат з добрымі адзнакамі. Гэта сведчыць аб тым, што прэстыж настаўніцкай працы павышаецца. У тым ліку дзякуючы той увазе, якая аказваецца гэтай сферы на ўзроўні Прэзідэнта і ўрада.

***— У некалькіх беларускіх ВНУ «недалічыліся» заяў, чакаецца дадатковы набор на бюджэтныя месцы. Ці будзе паніжана ніжняя планка адмоўных адзнак пры правядзенні дадатковага набору? І ці варта змяніць план набору на ўступную кампанію 2016 года?***

— Цяпер застаюцца вакантнымі больш за 350 бюджэтных месцаў у 11 ВНУ. Найбольшая колькасць незапоўненых бюджэтных месцаў у Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, Беларуска-Расійскім універсітэце, Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя П.В. Сухога. У конкурсе пры правядзенні дадатковага набору змогуць прыняць удзел абітурыенты, якія здалі неабходныя ўступныя іспыты на здавальняючыя адзнакі. Планка адзнак, што прыраўноўваюцца да нездавальняючых, зніжацца не будзе.

План набору ў наступным годзе будзе скарэкціраваны не толькі зыходзячы з вынікаў цяперашняй уступнай кампаніі, але і патрэб галін эканомікі. У прыватнасці, у перспектыве спатрэбяцца кадры па высокатэхналагічных спецыяльнасцях, напрыклад, з улікам стварэння вытворчасцяў у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

***— Колькі зарэгістравана зваротаў у дзяржкамісію па кантролі за ўступнымі іспытамі? Ці былі абгрунтаваныя скаргі?***

— З моманту стварэння дзяржкамісіі паступіла 43 пісьмовыя і вусныя звароты. Разглядаем іх аператыўна, дзейнічаючы ў адпаведнасці з заканадаўствам, і пры гэтым максімальна ўлічваем інтарэсы абітурыентаў. Прывяду прыклад. Паступіў зварот ад жанчыны, якая ніяк не магла паверыць, што яе сын заслужана атрымаў нізкі бал тэста, і прасіла прад'явіць арыгінал выкананага ім задання. Пайшлі насустрач — у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў ёй і сыну паказалі работу. Пытанне адпала само сабой — тэставыя заданні былі выкананы сапраўды дрэнна, балы тэсціравання былі аб'ектыўныя.

Дарэчы, паўторных зваротаў не было.

***— Калі будуць падведзены канчатковыя вынікі ўступнай кампаніі?***

— У канцы жніўня, пасля залічэння на ўсе формы навучання ў ВНУ і ССНУ. Хачу запэўніць, што яны будуць такія ж даступныя шырокай публіцы, як і вынікі ЦТ.

***— Наталля Іванаўна, вы ўпершыню сталі старшынёй дзяржаўнай камісіі па кантролі за ўступнымі іспытамі. На ваш погляд, якія змены трэба ўнесці ў работу камісіі?***

— Старшыня і члены дзяржаўнай камісіі традыцыйна па выніках работы рыхтуюць справаздачу, у якой знойдуць адлюстраванне прапановы па яе дзейнасці і якая будзе прадстаўлена кіраўніку дзяржавы.

***— Паступіць у ВНУ і ССНУ вельмі важна. Але ці стане дыплом аб заканчэнні ўстановы адукацыі для маладых людзей безумоўным пропускам у працоўную дзейнасць?***

— На жаль, на рынку працы рэспублікі назіраецца дэфіцыт адных кадраў і лішак іншых. Вырашэнне гэтай праблемы патрабуе комплекснага падыходу. Неабходна стварэнне аптымальнай сістэмы падрыхтоўкі кадраў розных прафесій і спецыяльнасцяў з улікам перспектыўных патрэб эканомікі і развіцця дэмаграфічнай сітуацыі.

Трэба палепшыць прафарыентацыйную работу, каб хлопцы і дзяўчаты ў старшых класах ведалі, якія прадпрыемствы, установы, арганізацыі ёсць у краіне, якія прафесіі найбольш запатрабаваны на рынку працы. У гэтым дапаможа і профільная адукацыя, якая прадугледжвае вывучэнне асобных прадметаў з 10-га класа на павышаным узроўні і правядзенне прафесійна-арыентаваных факультатыўных заняткаў, а таксама конкурсны адбор навучэнцаў. У той жа час захаваецца магчымасць навучання вучняў у 10-х класах на базавым узроўні.

***— І яшчэ аб адной навацыі. У СМІ прамільгнула інфармацыя аб тым, што быццам бы з верасня бягучага года пасада рэктараў ВНУ будзе выбарнай. Ці так гэта?***

— Прэтэндэнты на пасаду рэктара павінны будуць прадставіць савету ВНУ сваю праграму дзеянняў. Па выніках разгляду пададзеных праграм савет накіруе прапанову ў Міністэрства адукацыі, якое правядзе ацэнку кандыдатур па шэрагу крытэрыяў для іх назначэння ў адпаведнасці з заканадаўствам. Таму размова ідзе аб адборы кандыдатаў, зыходзячы з праграмы іх дзеянняў.

***— Наталля Іванаўна, вельмі хвалюе студэнтаў і іх бацькоў пытанне кошту навучання. Якія перспектывы на наступны навучальны год?***

— Хачу падкрэсліць: кошт навучання па раней заключаных дагаворах (для студэнтаў другога-пятага курса) не зменіцца. Ён не змяняўся і на працягу ўсяго 2014/2015 навучальнага года. Што датычыцца кошту навучання першакурснікаў, то ён вызначаецца, зыходзячы з затрат на падрыхтоўку спецыяліста па канкрэтнай спецыяльнасці — у дыяпазоне Br12-26 млн. Пры залічэнні студэнтаў заключаюцца дагаворы на навучанне, у якіх будзе названы кошт.

Гэтае пытанне знаходзіцца на пастаянным кантролі, кіраўнікі ўстаноў адукацыі нясуць персанальную адказнасць за неабгрунтаванае павышэнне кошту навучання.

**Алена ПРУС, БЕЛТА.**

■ Саюзны праект

## УРОКІ ГІСТОРЫІ ДЛЯ ПАКАЛЕННЯ «ВКОНТАКТЕ»

**30 ліпеня Мінск і Маскву злучыць відэамост, на якім будуць падведзены вынікі публічнага конкурсу на лепшы ўрок па гісторыі Вялікай Айчыннай. Конкурс арганізаваны Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы і міжнародным інфармацыйным агенцтвам «Россия сегодня».**

Відэасувязь злучыць «круглы стол» у маскоўскім міжнародным мультымедыйным прэс-цэнтры МІА «Россия сегодня» на тэму «70 гадоў міру: урокі вайны і гісторыя агульнай Перамогі» і студыю ў Нацыянальным прэс-цэнтры Беларусі.

Плануецца, што ў сустрэчы возьмуць удзел дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота, Старшыня Цэнтрвыбаркама Расійскай Федэрацыі Уладзімір Чураў, член Камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Ігар Марозаў, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя, дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, член журы конкурсу Сяргей Ходзін, фіналісты конкурсу, а таксама прадстаўнікі СМІ.

Конкурс, прысвечаны 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, праводзіўся ў два этапы з 24 лютага па 17 ліпеня 2015 года. Яго мэта — падтрымка новых фарматаў правядзення ўрокаў па гісторыі, якія спрыяюць выхаванню патрыятычных пачуццяў у школьнікаў, выяўленню агульных гістарычных каранёў расійскага і беларускага народаў. Удзельнікам мог стаць любы школьны настаўнік гісторыі (або настаўнік у кадэцкім корпусе, суворaўскім вучылішчы) Расіі і Беларусі ва ўзросце да 28 гадоў. Маладым педагогам былі прапанаваны на выбар пяць тэм для падрыхтоўкі прэзентацыі і сцэнарыя правядзення мультымедыйнага школьнага ўрока па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

■

■ Нарыхтоўкі

## ГРЫБЫ ПАЙШЛІ

**Арганізацыі спажыўкааперацыі гэтымі днямі пачынаюць масавую нарыхтоўку грыбоў і буякоў.**

Паводле інфармацыі **начальніка ўпраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксаны СКІНДЭР**, сёння ў насельніцтва ўжо закуплена 6 тон лісічак, якія прымаюць па 30-40 тысяч рублёў за кілаграм. Разам з тым спецыялісты галіны не чакаюць сёлета вялікага ўраджаю грыбоў.

Спажыўкааперацыя таксама прыступае да нарыхтоўкі дурніц (буякоў). Дзікарослыя ягады прымаюць нарыхтоўшчыкі па 15-18 тысяч рублёў за кіло. «Культурныя» дурніцы можна здаць па цане ад 70 тысяч рублёў і даражэй.

Умовы надвор'я сёлета паўплывалі на зніжэнне ўраджаю ягадных культур, аднак правільная арганізацыя працы нарыхтоўчай сеткі і яе даступнасць для сельскіх жыхароў дазволілі Белкаапсаюзу павялічыць аб'ёмы закупкі ягад у насельніцтва. Напрыклад, чарніц было нарыхтавана ў 2,4 раза больш, чым на аналагічную дату летась, а цяпер іх можна здаць па 20-24 тысячы рублёў за кілаграм. На 40% больш, чым летась цяпер нарыхтавана вішань, чарэшань і алычы. Сёлета насельніцтвам таксама было здадзена больш за 1 тысячу тон чырвоных і чорных парэчак і 15 тон малін.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

# УСЕ ХОЧУЦЬ «ПРЫГАРАД»!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Трэба ўдакладніць, што 5-гадовая забарона на адчужэнне тычыцца выключна зямельных участкаў, прадастаўленых грамадзяніну мясцовым выканаўчым камітэтам для вядзення калектыўнага садоўніцтва, калі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі ў грамадзяніна права на іх не мінуў пяцігадовы тэрмін.

Але забарона на адчужэнне зямельных участкаў не тычыцца тых «кавалкаў зямлі», а таксама садовых домікаў, права прыватнай уласнасці на якія перайшло па спадчыне (незалежна ад даты дзяржаўнай рэгістрацыі права прыватнай уласнасці спадчынадаўца і спадчыннікаў на зямельны ўчастак); якія набыты грамадзянінам на падставе грамадзянска-прававых здзелак (на падставе дагавораў куплі-продажу, дарэння, мены і г.д.). Не варта хвалявацца гаспадару зямлі, што належыць яму на правах пажыццёвага спадчыннага валодання або арэнды і была выкуплена ім у прыватную ўласнасць, калі з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі права пажыццёвага спадчыннага валодання або арэнды ў асобы, якой першапачаткова зямельны ўчастак быў прадастаўлены мясцовым выканаўчым камітэтам для вядзення калектыўнага садоўніцтва, прайшоў 5-гадовы тэрмін.

> **Дзяржава толькі тады гарантуе поўную абарону маёмасных правоў сваіх грамадзян, калі гэтыя правы афіцыйна аформлены.**

## Канфіскуюць часам сотнямі

Сёлета за першае паўгоддзе за неэфектыўнае выкарыстанне было канфіксавана каля 260 зямельных участкаў, якія раней былі прадастаўлены грамадзянам для будаўніцтва індывідуальнага жылля.

**Начальнік землеўпарадкавальнай службы Мінаблвыканкама Віктар МАНЕВІЧ** паведаміў, што ў 187 выпадках уладальнікі добраахвотна адмовіліся ад участкаў з-за адсутнасці фінансавых магчымасцяў для будаўніцтва жылых дамоў. У 71 выпадку пытанне вырашалася ў прымусовым парадку. Больш за ўсё канфіскавана ўчасткаў у Мінскім (63), Салігорскім (29), Дзяржынскім і Стаўбцоўскім (па 24), Валожынскім (21), Пухавіцкім (17), Барысаўскім (16) і Лагойскім (14) раёнах.

Бывае, што некаторыя грамадзяне ўжо пасля прыняцця рашэння аб спыненні правоў на зямельны ўчастак самавольна пачынаюць будаўніцтва дома на ім. І ў такім выпадку даводзіцца дзейнічаць праз суд. Віктар Маневіч тлумачыць, што, у адпаведнасці з заканадаўствам, грамадзянін абавязаны прыступіць да засваення зямельнага ўчастка на працягу года з моманту атрымання дакументаў на яго. Калі ўмова не выканана, мясцовы выканкам выдае прадпісанне з указаннем тэрміну, на працягу якога неабходна пачаць выкарыстанне зямлі па мэтавым прызначэнні. У выпадку невыканання гэтага патрабавання мясцовыя ўлады прымаюць рашэнне аб спыненні правоў на зямельны ўчастак і накіроўваюць яго ў Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры для ўнясення адпаведных змен. Калі ўчастак знаходзіцца ў прыватнай уласнасці, то яго адабранне ажыццяўляецца праз суд.

У далейшым адабраныя зямельныя ўчасткі пераразмяркоўваюць паміж грамадзянамі, якія маюць у іх патрэбу. Толькі за першае паўгоддзе сёлета пераразмеркавана 150 такіх участкаў. Частка іх, асабліва размешчаных у прыгараднай зоне Мінска, прадаецца на аўкцыёнах.

*kurkach@zviazda.by*

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

*Сёлета 13 ліпеня Прэзідэнтам Беларусі быў падпісаны Указ № 323 (уступіць у сілу 16 студзеня 2016 г.). Згодна з ім, грамадзяне, якія маюць зямельныя ўчасткі для вядзення калектыўнага садаводства, але не зарэгістравалі ў вызначаным парадку свае правы на іх, абавязаны звярнуцца ў адпаведную арганізацыю для дзяржаўнай рэгістрацыі сваіх правоў на зямельныя ўчасткі.*

*Пры выяўленні мясцовымі выканкамамі незарэгістраваных участкаў грамадзянам будуць накіроўвацца прадпісанні аб неабходнасці звярнуцца ў гэтыя выканкамы з заявай аб выдачы адпаведных дакументаў на іх у месячны тэрмін з дня атрымання такога прадпісання. Невыкананне патрабаванняў, якія змяшчаюцца ў такіх прадпісаннях, з'яўляецца падставай для канфіскацыі зямельных участкаў.*

*Варта адзначыць, што заканадаўчыя абавязкі рэгістраваць свае правы на зямлю ў садоўніцкіх таварыствах з'явіліся ў жніўні 2008 года з прыняццем Указа Прэзідэнта № 50, якія потым падаўжаліся да 1 студзеня 2012 года.*

***У Дзяржкаммаёмасці чарговы раз нагадваюць: дзяржава толькі тады гарантуе поўную абарону маёмасных правоў сваіх грамадзян, калі гэтыя правы афіцыйна аформлены.***

**РЫНАК ПРАЦЫ**

# З ПРАГРАМІСТАЎ У... ГАНДЛЯРЫ

## Сярэднестатыстычны беспрацоўны Віцебшчыны — 41-гадовы мужчына з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй

**Бадай, ніхто з паэтаў яшчэ не «пераплюнуў» Маякоўскага, які вельмі добра рэкламаваў некаторыя прафесіі. Памятаеце: «Нужные работники — столяры и плотники!». А вось яшчэ цытата: «Докторам хорошо, а рабочим — лучше...» А скончыў свой «гімн» прафесіям паэт такім вывадам: «Все работы хороши, выбирай на вкус!»**




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Сёння на Віцебшчыне ў рэйтынгу самых запатрабаваных прафесій швачка, слесар, электраманцёр... А яшчэ рэгіёну вельмі не хапае вадзіцеляў, кухараў, цырульнікаў, гандляроў. У «топавым» спісе таксама бухгалтары, інжынеры, медыцынскія сёстры, урачы. У сельскай мясцовасці вельмі запатрабаваныя трактарысты, аператары машыннага даення, жывёлаводы, ветурачы.

За паўгоддзе ў вобласці вярнулася на «біржу працы» больш як 21 тысяча чалавек — на 13% больш, чым летась. У тым ліку на 30% больш зарэгістравана беспрацоўных.

Адна з іх, якой ужо «за 40» (думаю, у гэтым выпадку можна не быць джэнтльменам), у БДУ атрымала спецыяльнасць праграміста. Дык і працавала б, тым больш што менавіта праграмісты ў лідарах па ўзроўні зарплаты... Але ж чамусьці прэстыжная прафесія ёй не падабалася. Перакваліфікавалася ў эканамісты. Плацілі мала. Калі ўрэшце зразумела, што нават з падпрацоўкай не можа зарабіць на прыстойнае жыццё, звольнілася. Спачатку шукала працу праз знаёмых. Але такія ж, як яна, або самі марылі знайсці лепшае месца, або казалі, што эканамісты ім не патрэбны... Нарэшце, жанчына знайшла вакансію ў буйным гандлёвым цэнтры, які ў хуткім часе павінен быў адчыніцца. У выніку на «біржы працы», дзе яна ўжо была зарэгістравана, атрымала накіраванне на курсы гандляра. Цяпер практыку праходзіць...

— Па інфармацыі на пачатак ліпеня, з больш чым 7 тысяч беспрацоўных, якія стаяць на ўліку, 37% — жанчыны. Пры гэтым колькасць жанчын на 5% зменшылася ў параўнанні з пачаткам года. Такім чынам, на сёння ў беспрацоўя Віцебшчыны мужчынскі твар. Сярэднестатыстычны беспрацоўны — гэта 41-гадовы мужчына з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй, — расказвае **Ірына МАТВЕЕВА, намеснік старшыні камітэта па працы занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама.**

Найменш канкурэнтаздольныя на рынку працы людзі з абмежаванымі магчымасцямі, перадпенсійнага ўзросту, вызваленыя з месцаў пазбаўлення волі, — такіх сярод беспрацоўных каля 25%.

— Сёлета дэкрэт «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» падштурхнуў да легалізацыі тых працаздольных грамадзян, якія афіцыйна не працавалі і не былі раней зарэгістраваныя ў якасці беспрацоўных. Павелічэнне колькасці зваротаў па працу тлумачыцца і аптымізацыяй колькасці работнікаў, скарачэннем вакансій на прадпрыемствах і ў арганізацыях, — каментуе Ірына Матвеева.

А ў сувязі з сумна вядомымі падзеямі ва Украіне, верагодна, тысячы ўкраінцаў шукаюць у нас працу? Аказалася, што іх не так ужо і многа. Ды і не ўсім ідуць насустрач — вядома ж, у першую чаргу трэба ўладкоўваць на працу суайчыннікаў.

— Так, сёлета ў нас большасць імігрантаў з Украіны — 52,4%, а таксама з Кітая — 33,2%... Усяго іх 885 з 26 краін: працуюць на лесанарыхтоўках, дрэваапрацоўцы, будаўніцтве і ў сельскай гаспадарцы, — дадала супрацоўніца камітэта.

Сярэднямесячная зарплата ў Прыдзвінскім краі ў маі (апошнія звесткі. — **Аўт.**) склала 5,8 мільёна рублёў.

— З пачатку года і ў маі Віцебшчына сярод іншых абласцей і Мінска на 5-м месцы па ўзроўні зарплаты. Апярэджвае Брэстчыну і Магілёўшчыну, — канстатуе **Святлана ЗІНОЎЕВА, начальнік упраўлення сацыяльна-працоўных адносін і заработнай платы вышэйзгаданага камітэта.**

Найбольшы заробак у будаўнікоў — перавышае 6,8 мільёна рублёў. Для параўнання, у бюджэтнікаў — каля 4,7 мільёна, працаўнікоў вёскі — прыкладна 4,5 мільёна... На прамысловых прадпрыемствах сярэдні заробак — больш за 6,5 мільёна, а ў сферах транспарту і сувязі, гандлю зарплата аднолькавая: пад 5,4 мільёна.

— Зарплата ў маі ў адносінах да студзеня павялічылася ў сярэднім на 565 тысяч рублёў, або на 10,6%... Распаўсюджваюцца так званыя гнуткія сістэмы аплаты працы: калі работнікі зацікаўлены ў больш эфектыўнай дзейнасці арганізацыі, прадпрыемства. Апошніх з такой формай аплаты ўжо больш за 1000. І ўсе арганізацыі камунальнай формы ўласнасці перайшлі на гэтую практыку стымулявання працы, — працягвае Святлана Зіноўева.

На жаль, вельмі актуальным застаецца пытанне своечасовай выплаты заробку. Пратэрмінаваную запазычанасць мелі 175 арганізацый на агульную суму 96655,8 мільёна рублёў. І амаль што ўсе даўжнікі (164) — арганізацыі аграпрамысловага комплексу. За тое, што людзі чакалі заробленае, прыцягваліся да дысцыплінарнай адказнасці старшыні райвыканкамаў і іх намеснікі 12 раёнаў, чыноўнікі Віцебскага гарвыканкама... А кіраўнікоў 5 арганізацый вызвалілі ад пасады.

Эксперты лічаць: каб зарплата выплачвалася своечасова і павышалася, кіраўнікі павінны па-іншаму вырашаць фінансава-эканамічныя праблемы. Зарплата павінна быць заробленай, а не налічанай...

А не хочаш, як той сказаў, «працаваць на дзядзьку», можаш распачаць сваю справу. З боку дзяржавы гарантуюць падтрымку. Свежы прыклад: днямі «новая» прадпрымальніца запрасіла на прэзентацыю цырульні. Прайшла адпаведнае навучанне, атрымала фінансавую пазыку. Словам, ёсць нагода для яшчэ аднаго рэпартажу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

# 36 МІЛЬЁНАЎ І ІНШАМАРКА... ЗА ЛАСЯ

**Суровага пакарання за самавольства не пазбеглі два жыхары Гродзенскага раёна, парушыўшы Правілы вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання.**

Каля вёскі Зарубічы яны знайшлі тушу забітага лася, аднак не паведамілі пра гэта ні работнікам лясной гаспадаркі, ні міліцыі. Дачакаліся ночы, разабралі тушу і развезлі мяса па дамах. Аднак гэтая самавольная здабыча абярнулася для іх сур'ёзнымі непрыемнасцямі, бо парушальнікаў аператыўна выявілі супрацоўнікі міліцыі. Паводле інфармацыі з Гродзенскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, суд прызнаў іх вінаватымі ў незаконным транспартаванні і разбіранні дзікай жывёлы. Аднаго мужчыну пакаралі штрафам у памеры 36 мільёнаў рублёў, а ў другога канфіскавалі аўтамабіль «Рэно Лагуна», які выкарыстоўваўся для перавозкі мяса.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# ЗНЕСЦІ...
## А ПОТЫМ ПАРАДАК НАВЕСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Самае каштоўнае, што мы, беларусы, маем, — гэта зямля, і распараджацца ёю трэба па-гаспадарску, — упэўнена **старшыня Клецкага раённага Савета дэпутатаў Святлана ЧАКУН.** — Аддаленыя ад прамысловых цэнтраў, ад сталіцы раёны, як наш, адчуваюць на сабе прыкметы ўрбанізацыі — калі пусцеюць домаўладанні. Таму ў раёне і вядзецца актыўная работа па зносе закінутых пабудоў. Летась знеслі 127 аварыйных жылых дамоў, а вызваленыя ўчасткі рэкультывуюцца. Там сёлета ўжо растуць кукуруза, збожжавыя, рапс, проса. Бясспрэчна, гэта складаная работа, якая патрабуе і фінансавых сродкаў, і чалавечых высілкаў. Перш, чым прыйдзе тэхніка, на ўчастках працуюць людзі, збіраюць тое, што яшчэ можна выкарыстаць: камлі дрэў на распальванне печаў, драўляныя рэшткі, цэглу, бетонныя блокі. Ёсць матэрыялы, якія трэба ўтылізаваць. Калі зямельны ўчастак размешчаны непадалёку ад палігона, то ўсё перавозіцца туды... Але бывае, што рабіць гэта эканамічна нявыгадна, стратна. У кожным выпадку знаходзім індывідуальнае рашэнне. Скажам, гаспадары на сваім падворку мелі склеп ці падвал. Гэтыя штучныя поласці і запаўняем непатрэбнымі матэрыяламі.

Толькі ў 2014 годзе сельгасарганізацыям раёна перададзена 115 гектараў зямлі, што не выкарыстоўвалася грамадзянамі. Цяпер яна працуе на эканоміку раёна.

— Але самае галоўнае для нас — удзячнасць жыхароў, — канстатуе Святлана Чакун. — Вядома, праблемы ўзнікаюць з уладальнікамі сядзіб, дакладней з тымі, хто па законе павінен уступіць у права спадчыны. Ды мы імкнёмся вырашаць пытанні мірна, шукаем спадчыннікаў, угаворваем іх, каб папярэдзіць у далейшым канфліктныя сітуацыі.

Дарэчы, добраўпарадкаванне глыбінкі, як правіла, пачынаюць зімой. Высякаюць кустоўе, быльнёг, а вясной ужо зносяць фундамент, вядуць земляныя работы.

Вёска Узнога таксама знаходзіцца ўдалечыні ад вялікіх шляхоў, і жывуць тут у асноўным пажылыя людзі. Але, незалежна ад узросту, чалавек хоча, каб не толькі на яго падворку быў парадак, але і на вуліцы, і ў населеным пункце.

— Усе старыя дамы ў нас прыбіраюцца, участкі абкошваюцца, засяваюцца. Пра гэта клапоціцца і старшыня сельскага Савета, і кіраўніцтва адкрытага акцыянернага таварыства «Морач», якое дапамагае тэхнікай, — адзначае Тамара Бондар, што жыве ў вёсцы 47 гадоў.

— Моладзі ў нас практычна няма, — дадае яна. — Дачнікаў таксама. Пустуючыя бацькоўскія дамы аформілі на сябе спадчыннікі, летам яны звычайна прыязджаюць у свае радавыя гнёзды, засяваюць агароды. А старыя «нічыйныя» домаўладанні ідуць пад знос.

Непаразуменняў са спадчыннікамі не ўзнікае, паколькі мясцовыя ўлады падыходзяць да пытання адказна: абзваньваюць іх, вядуць перамовы. Калі тыя не збіраюцца выкарыстоўваць дом, то даюць згоду на знос.

Побач з сядзібай Рэгіны Барташэвіч стаіць безгаспадарчы дом. Унук, што прыязджае да бабулі з Мінска, навёў тут парадак, а на «нічыйным» участку разводзіць дурніцы. Добры прыклад, як кажуць, — узор для іншых.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Наогул, на Міншчыне амаль не знойдзеш паселішча, дзе б пытанні добраўпарадкавання не хвалявалі як саміх жыхароў, так і кіраўніцтва сельскага Савета, раённага Савета дэпутатаў, райвыканкама.

— Патрабаванні навесці парадак на зямлі былі выказаны ў свой час кіраўніком дзяржавы. У краіне шмат зроблена ў гэтым кірунку. Мы ганарымся прыгажосцю нашых вёсак, пасёлкаў. У нас добрыя дарогі, роўныя, незасмечаныя палі. Але яшчэ хапае пытанняў, над якімі трэба сур'ёзна працаваць. Гэта знос пабудоў прамысловага прызначэння, жывёлагадоўчыя комплексы, што не выкарыстоўваюцца па 20 і больш гадоў... Другая праблема — знос індывідуальных жылых дамоў, дзе на працягу многіх гадоў ніхто не жыве. Гэта, да ўсяго іншага, яшчэ і бяспека нашых дзяцей, — лічыць **старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА.**

Сапраўды, дзеці ёсць дзеці, і не заўсёды дарослыя могуць іх пракантраляваць. Ужо былі выпадкі, калі малыя, даследуючы аварыйныя дамы, наступалі на цвікі, атрымлівалі іншыя траўмы. А ў Смалявіцкім раёне хлопчык упаў у траншэю, і яго доўга не маглі знайсці.

— Вядома, бываюць і нараканні, што мы парушылі заканадаўства аб зносе старых пабудоў. Усё павінна быць у разумных межах: калі можна выкарыстоўваць нейкія матэрыялы, то трэба гэта рабіць. Напрыклад, жалезабетон здрабніць і захаваць у кар'еры. Але для гэтага патрэбна шмат драбілак. Такіх машын пакуль мала. Разам з тым мы абавязалі ўсіх кіраўнікоў вызваленую зямлю ўцягваць у севазварот: тут павінны расці розныя культуры або ўзводзіцца новыя пабудовы. Пакуль жа яшчэ не ўсюды наведзены парадак, засталіся рэшткі жалезабетону, цэглы. У Клецкім раёне за год знесена каля 127 прыватных дамоў, а ўчасткі засеяны. Тая работа, якую выконваюць сельсаветы, райвыканкамы, сельгасарганізацыі, своечасовая і карысная для нашай экалогіі, краіны, людзей. А самае галоўнае — у вёсках стала чысцей, — падсумаваў кіраўнік цэнтральнага рэгіёна.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*lazovskaya@zviazda.by*

# «ГЕРОІ» НА КАНТРОЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Гаспадыня халупы Жанна Міхайлаўна жыве тут з 16-гадовым сынам Алегам. Старэйшая яе дачка перабралася ў Гомель. Алег радасна паведамляе, што залічаны ў гомельскі прафесійны ліцэй — будзе будаўніком. Яго маці ніяк не хоча ўступіць у права спадчыны на дом пасля смерці мужа. Чаму? Адказ на гэтае пытанне мы не можам знайсці. Дарэчы, як і старшыня сельскага Савета Галіна Чумакова. Яна ўжо шмат разоў растлумачвала гаспадыні, куды трэба пайсці і да каго звяртацца. Але ж беспрацоўная жанчына, у якой няма парадку ні ў доме, ні на агародзе, на ўсе пытанні адказвае аднолькава:

— Вінаватая я...

— У вас жа невялікі агарод, — кажа Галіна Мікалаеўна. — Пасадзілі б кусты — ягады на рынку прадавалі б.

— А каму патрэбны гэтыя ягады?

— Жыць у вёсцы і не выкарыстоўваць зямлю — не разумею, як гэта магчыма? Праблема ў тым, што вы нікуды не ездзіце і нічым не займаецеся. Пад ляжачы камень вада не пацячэ. А ваш сын Алег не зможа стаць на ўлік тых, каму патрэбна жыллё... А калі б вы ўступілі ў права спадчыны, то жыллё прызналі б непрыдатным для пражывання — і ён стаў бы ў чаргу.

— Так, я вінаватая. Ой...

Дыялог заходзіць на другі круг. Тым часам у калідоры выяўляецца небяспечная праводка. Адсутнічае корпус разеткі. Печка таксама мае патрэбу ў рамонце.

— Я на зіму замажу, — абяцае Жанна.

Прынамсі, тым, каму патрэбна дапамога, яе аказваюць тры сацыяльныя работнікі, якія працуюць у вёсках Прыбыткаўскага сельсавета. Многім тут бясплатна ўсталявалі пажарныя апавяшчальнікі. Інспектар сам іх прыкручвае і правярае работу. У гэтым мы пераканаліся на свае вочы ў сям'і Анатоля і Наталлі Анішчанак, якія жывуць у шматкватэрным доме ў Зябраўцы.

Інспектар нагляду і прафілактыкі Гомельскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Аляксандр Удодаў не толькі пераканаўся, што адзін з апавяшчальнікаў не працуе, але і прымусіў гаспадара схадзіць у краму і купіць новую батарэйку. Толькі пасля таго, як усё было заменена, «адчапіўся» ад Анатоля. З мужчыны, дарэчы, пакуль не знята судзімасць за справы мінулыя, таму ён імкнецца паводзіць сябе добра.

> **Здаецца, «мазанка» з цэлафанам замест вокнаў была пабудавана ў пазамінулым стагоддзі. І менавіта з таго часу тут ніхто і ніколі не браў у рукі анучу.**

У сям'і, якая жыве ў двухпакаёўцы, атрыманай па льготным крэдыце, — пяцёра дзяцей. Маці Наталля выхоўвалася ў дзіцячым доме, таму спачатку зусім не мела навыкаў вядзення гаспадаркі. Але ж на гэты раз старшыня сельскага Савета застаецца больш-менш задаволенай: многае



Члены назіральнай камісіі ведаюць сваю справу.

змянілася ў лепшы бок. Галіна Мікалаеўна зазірае ў халадзільнік, задае пытанні наконт аплаты жылля і дапамог на дзяцей, тлумачыць, як налета ўзяць зямельны ўчастак пад вырошчванне гародніны і як адвучыць дзіця ад памперсаў...

— Так, дзіцячыя рэчы ў доме чыстыя, прадукты харчавання ёсць. Тут быў нядаўна інцыдэнт, але мы растлумачылі, што, калі гаспадары будуць сюды гасцей запрашаць — забяром дзяцей. Анішчанкі дзецьмі даражаць, таму і імкнуцца нешта рабіць. З гэтай сям'ёй мы працуем даўно, пры актыўнай дапамозе сацыяльных педагогаў мясцовай школы. Наталля ж калісьці не ведала, як распараджацца грашовымі сродкамі, як правільна прыгатаваць ежу... Шмат ёсць нюансаў, з чым прыходзіцца сутыкацца ў такіх сем'ях...

Дарэчы, каля 70% дзяцей, якіх камісійна вымушаны былі забраць у бацькоў, потым у сем'і вярнуліся. Работу праводзяць і праваахоўнікі. Бацька праблемнай сям'і з Клімаўкі, у якой выхоўваецца трое дзяцей, быў змешчаны на невялікі тэрмін у выпраўленчую ўстанову за абразу ўчастковага міліцыянера. Пасля здарэння, відаць, тое-сёе асэнсаваў, таму цяпер куды цішэй паводзіць сябе і са сваякамі.

— Нашы грамадзяне, на жаль, не дысцыплінаваныя, і іх прыходзіцца кантраляваць пастаянна, — заўважае Галіна Чумакова. — Калі ведаюць, што да іх прыйдуць і праверацць, тады і комін пачысцяць, і расколіну замажуць. Кагосьці ўгаворваем, а кагосьці і штрафам караем. Хтосьці лічыць, што гэта нармальна — жыць у беспарадку, нават не ведае, што можна інакш. Хтосьці не навучаны нешта рабіць і не бачыць, што так сябе паводзіць — дрэнна. Я перажываю за ўсіх.

Між тым самая вялікая колькасць сацыяльна небяспечных сем'яў у Прыбыткаўскім сельсавеце была зарэгістравана ў 2012-2013 гадах — 17. Цяпер іх засталося 12. Паступовая работа працягваецца і прыносіць плён. Аднак і тыя, хто з уліку ўжо зняты, знаходзяцца ў полі зроку кіраўніка сельсавета, мясцовых дэпутатаў і ўсіх жыхароў, якія добра ведаюць — хто, што, дзе, калі і з кім...

**Фота аўтара.**

*astashkevich@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.569. Нумар падпісаны ў 19.30 28 ліпеня 2015 года.**

# ПСІХАЛОГІЯ ПАСПЯХОВАЙ ПРАЦЫ,
## або Як прасунуцца па кар'ернай лесвіцы

**Няма нічога больш казытлівага для нерваў, чым паспрабаваць папрасіць павышэння ў свайго начальства, нават калі вы гэтага сапраўды заслугоўваеце. Існуе мноства артыкулаў у інтэрнэце аб тым, як гэта рабіць, аднак нашмат менш тых, што падкажуць найбольш спрыяльны час. Бо многае ўскладняецца яшчэ і тым, што вы можаце трапіць на размову да свайго начальніка якраз у той момант, калі ён у дрэнным настроі. Існуе думка, што поспех у просьбе аб павышэнні залежыць ад таго, у які час дня і тыдня аб ім прасіць. Шмат што залежыць ад вашага начальніка і ад вашых асабістых якасцяў і псіхалагічнага стану. Зразумела, што не існуе адзінай універсальнай формулы для кожнай канкрэтнай сітуацыі, але ёсць некаторыя правілы, якія павінны дапамагчы ў выбары часу.**



### ПАНЯДЗЕЛАК — ЦЯЖКІ ДЗЕНЬ

Не трэба быць з двума віхрамі, каб зразумець, што панядзелак — не найлепшы час, бо гэта дзень, калі многія супрацоўнікі прыходзяць на працу пасля «лянівых выхадных». Калі вы вырашылі гаварыць аб павышэнні, то разумна будзе ўсё ж чакаць сярэдзіны тыдня.

### УЗАЕМАПАРАЗУМЕННЕ БОЛЬШ «СВЕЖАЕ» РАНІЦАЙ

Няма дакладных даследаванняў пра тое, каб прасіць павышэння менавіта раніцай, але ёсць нямала інфармацыі з іншых сфер псіхалогіі. Амерыканскія эксперты прыйшлі да думкі, што больш спагадлівым ваш начальнік можа быць менавіта раніцай. Існуе так званы «эфект ранішняй маральнасці» — людзі больш спагадлівыя менавіта раніцай — да таго, пакуль не паспяваюць стаць раздражнёнымі. У гэтым выпадку мае сэнс пагаварыць з начальнікам, калі ён яшчэ ў добрым настроі, напрыклад, пасля ранішняй кавы. Але пачакайце таго моманту, калі ваш кіраўнік скончыць сваю рабочую руціну, якая на пачатку дня заўсёды прысутнічае.

### ПЯТНІЦА МОЖА БЫЦЬ НАЙЛЕПШЫМ ДНЁМ!

Дакладна разлічыўшы, што ваш начальнік не збіраецца пачаць свае выхадныя з пятніцы, для вас будзе вельмі зручным перагаварыць аб павышэнні менавіта ў гэты дзень. Ваш начальнік у прадчуванні выхадных, хутчэй за ўсё, будзе ў добрым настроі. А вось вечара пятніцы, на думку амерыканскіх псіхолагаў, чакаць не варта. Да гэтага часу вы можаце страціць свой зарад упэўненасці, ды і ваш начальнік, хутчэй за ўсё, будзе спешна пакідаць офіс. У выпадку, калі ваша павышэнне адхіляць, у вас будзе час, каб выпрацаваць новую стратэгію. А калі прымуць — усе выхадныя наперадзе, каб адсвяткаваць.

### НЕ ЎСЕ КАМПАНІІ АДНОЛЬКАВА РАНІШНІЯ

З кожнага правіла ёсць выключэнні, у тым ліку і з «ранішняй тэорыі». Для некаторых кампаній вячэрні час можа быць менш стрэсавым. Калі дзень быў досыць плённы і вы адчуваеце, што ў офіснай атмасферы пераважае пазітыўны настрой — самы час падысці да начальніка і пагаварыць наконт вашага павышэння.

### ВЕДАЙЦЕ, НАКОЛЬКІ ЗАГРУЖАНЫ ВАШ КІРАЎНІК

Каб лепей падысці да начальніка для размовы, ведаць яго/яе звычкі і асаблівасці яшчэ недастаткова. Неабходна быць у курсе працоўнага графіка. Бо калі ён/яна загружаны, пра тое каб разгледзець ваша павышэнне, хутчэй за ўсё, не можа быць і гаворкі. Найлепшы дзень для размовы тут вызначае менавіта тое, ці завяршае ваша начальства, напрыклад, які-небудзь важны праект, або толькі да яго прыступае. Ваша задача — дакладна ведаць аб тым самым дні, калі вы атрымаеце максімальную ўвагу без усялякіх вонкавых фактараў. Не прасіце аб павышэнні падчас выканання важнай стрэсавай працы. Лепш за ўсё пачакаць яе заканчэння. У журналістыцы, напрыклад, лепш за ўсё гэта рабіць пасля добрай вёрсткі або эфіру.

### ДУМКІ ЎПЛЫВАЮЦЬ НА СТАНОВІШЧА

Але самае важнае (нават больш, чым час дня, тыдня, настрой ці загружанасць вашага начальніка), на думку амерыканскіх псіхолагаў, — менавіта ваша перакананасць у тым, што вы аб'ектыўна просіце аб сваім павышэнні згодна з вашымі заслугамі і навыкамі. Вы самі павінны лічыць, што прыклалі шмат намаганняў і вы досыць кампетэнтны, каб атрымаць павышэнне. У першую чаргу перад вашымі вачыма павінен быць спіс тых прычын, па якіх, як вы лічыце, вас павінны павысіць. Гэта дазволіць набрацца ўпэўненасці, перш чым гаварыць з начальнікам.

### ЁГА І РЭПЕТЫЦЫІ

Беларускія спецыялісты таксама сыходзяцца на думцы, што ў першую чаргу неабходна ведаць, чаму менавіта вы павінны атрымаць павышэнне. Па словах псіхолага Цэнтра паспяховых адносін Вольгі Гарбаценкі, размовы аб павышэнні лепей весці ў прыватнай размове.

«Ніякіх папер з просьбай аб павышэнні пісаць не трэба. Прычым дамаўляцца пра тое, каб атрымаць больш высокую пасаду, неабходна адразу з пачатку размовы. Начальнік, магчыма, будзе супраціўляцца, спрабаваць знайсці аргументы, каб адмовіць. У гэты момант неабходна пачаць свой аповед, чаму вы лічыце, што заслугоўваеце павышэння. Важны момант тут — асабістая эфектыўнасць, якая будзе адлюстравана ў якой-небудзь статыстыцы ці ў колькасці і якасці завершаных праектаў. Гэтыя довады лепей прыводзіць, пакуль начальнік не скажа нешта канкрэтнае. Што тычыцца часу, то лепш за ўсё просьбы аб павышэнні адрасаваць да начальніка ў першай палове дня», — патлумачыла Вольга Гарбаценка.

Таксама спецыяліст адзначыла, што часам можна нават перабольшваць свае дасягненні.

«Галоўнае, каб вы былі згодны з тым, пра што ідзе гаворка. Бо плацяць работніку менавіта столькі, наколькі ён лічыць сваю працу каштоўнай. Вы не павінны прасіць, каб вам пазычылі пасаду. Вы павінны адчуваць, што менавіта на гэтым месцы будзеце добра спраўляцца са сваімі абавязкамі», — удакладніла Вольга Гарбаценка.

Таксама яна параіла ўсім, хто хвалюецца, выкарыстоўваць дыхальныя практыкаванні для супакаення. Аб некаторых можна прачытаць у кнігах па ёзе. «Рэпетаваць за некалькі дзён да размовы свае словы перад сябрамі або люстэркам будзе таксама нядрэнна», — падагульніла спецыяліст.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

# Абярэг на ўраджай

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

З пачатку кампаніі і па сённяшнюю раніцу з палёў «Агра-Абярэгу» ўбрана збожжавых на плошчы 320 гектараў.

— Добры тэмп набралі нашыя механізатары і вадзіцелі. Яны не навічкі, а вопытныя, праверaныя ў працы спецыялісты, даўно працуюць, на іх можна цалкам палажыцца», — гаворыць пра хлебаробаў галоўны агранам гаспадаркі Раіса Ясімчык. — Кожны з удзельнікаў жніва хоча і паболей намалаціць, і перавезці ўраджай. Гэта магчыма, бо тэхніка ў нас новая, дагледжаная.

У гаспадарцы падлічылі, што на жніве на кожны камбайн кладзецца нагрузка каля 300 гектараў. Сёлета ў «Агра-Абярэгу» жытам, пшаніцай, ячменем, аўсом і трыцікале засеяна 2600 гектараў. І яшчэ 400 гектараў аддадзена пад рапс. Па словах галоўнага агранома, ураджай на палетках выспеў добры, па 35-40 цэнтнераў, а на некаторых участках азімай пшаніцы — нават пад 50 цэнтнераў з гектара. Раіса Дзмітрыеўна працуе ў гэтай гаспадарцы амаль чвэрць стагоддзя, яна ведае кожны лапік зямлі, як свае рукі, ведае, якія на гэтых глебах можна атрымаць ураджаі. А яны ў «Агра-Абярэгу» кожны год стабільна высокія, вал збожжа тут не менш за 10 тысяч.



**Для вопытнага вадзіцеля «МАЗа» Юрыя ЯСІМЧЫКА гэты сезон — ужо 25-ты.**



На полі, на якім мне давялося здымаць гэты фотарэпартаж, адбылася сустрэча з камбайнерам Сяргеем Дулікам, які прыехаў з Ганцавіч Брэсцкай вобласці і дзявяты сезон тут на жніве. Ён зарэкамендаваў сябе як класны спецыяліст і на сваім камбайне КСЗ-10 (дарэчы, гомельскай вытворчасці) заўсёды ў першых шэрагах. Спадзяецца, што і сёлета яго машына не падвядзе...

Спадзяюцца на ўдачу і прафесійныя веды механізатары Мікалай Паўлоўскі, Анатоль Савіч, Уладзімір Рунец і самы малады Аляксей Верасовіч, які толькі пяты сезон на жніве.

На поле прывезлі абед. Закончыўшы свае загоны, камбайнеры спяшаюцца да перасоўнай кухні, мыюцца, палуднуюць, дзеляцца навінамі. Аглядаюць свае машыны, мыюць ад пылу ветравыя шыбы на кабінах і запускаюць рухавікі. Бітва за ўраджай працягваецца.

**Анатоль КЛЯШЧУК.** *anatol@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Добрая навіна

# ДЭМАГРАФІЯ З «ПЛЮСАМ»
## Колькасць насельніцтва краіны павялічылася

**Паводле апошніх звестак, колькасць жыхароў Беларусі складае 9 млн 485,3 тыс. чалавек. У параўнанні з пачаткам гэтага года нас стала больш на 4 474 чалавекі, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

У сталіцы цяпер афіцыйна налічваецца 1 млн 939,8 тыс. чалавек. Сярод абласцей найбольшая колькасць жыхароў у Гомельскай — 1 млн 424 тыс. чалавек. На Міншчыне пражываюць 1 млн 416,1 тыс. чалавек, Брэстчыне — 1 млн 388,5 тыс., Віцебшчыне — 1 млн 1915,9 тыс., Магілёўшчыне — 1 млн 68,9 тыс., Гродзеншчыне — 1 млн 52,1 тыс. чалавек.

Як адзначылі ў Нацыянальным статкамітэце, сёлета цягам студзеня—чэрвеня ў Беларусі з'явіліся на свет 56 548 немаўлят. Тут зноў-такі ў лідарах сталіца, дзе за гэты час нарадзілася 10 888 дзяцей. На Міншчыне ў першым паўгоддзі з'явіліся на свет 9 203 дзіцяці, Гомельшчыне — 8 704, Брэстчыне — 8 684, Гродзеншчыне — 6 572, Віцебшчыне — 6 317, Магілёўшчыне — 6 180 дзяцей. Пры гэтым колькасць жыхароў сталіцы ў студзені—чэрвені павялічылася больш чым на 2 тысячы чалавек менавіта за кошт натуральнага прыросту.

Цягам першага паўгоддзя заўважным аказаўся міграцыйны прырост насельніцтва Беларусі — больш чым за 10,5 тыс. чалавек. Гэтая лічба ў параўнанні з такім жа часам летась павялічылася удвая (з 5,3 тыс. чалавек). Асноўны міграцыйны абмен прыпадаў на краіны СНД — адтуль у першым паўгоддзі прыбыло больш за 12 тысяч чалавек.

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, цягам студзеня—чэрвеня ў Беларусі было зарэгістравана 31,4 тысячы шлюбаў. Сярод пазітыўных тэндэнцый — змяншэнне колькасці разводаў.

**Захар БУРАК.**

■ Май на ўвазе!

# У ТУРЦЫЮ — З АСЦЯРОГАЙ
**Турысты маюць права адмовіцца ад паездкі ў Турцыю або перанесці яе на іншую дату**

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў дэпартаменце па турызме Міністэрства спорту і турызму, каментуючы правы турыстаў у сувязі з сітуацыяй, што склалася ў гэтай краіне.

Спецыялісты звярнулі ўвагу, што ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам турысты, якія ўжо заключылі дагавор аказання турпаслуг і хочуць захаваць грошы за тур, маюць права звярнуцца ў сваю туркампанію з просьбай перабраніраваць тур на іншую дату або іншую краіну. Калі перабраніраваць тур немагчыма, турысты маюць права адмовіцца ад падарожжа ў Турцыю. Улічваючы, што да запланаванага падарожжа можа заставацца няшмат часу, туркампаніі могуць утрымаць з турыстаў расходы, звязаныя з арганізацыяй паездкі. Пры нязгодзе з сумай фактычна панесеных расходаў, выстаўленых кампаніяй, турыст мае права іх аспрэчыць, у тым ліку ў судовым парадку.

Дадатковую кансультацыю, у тым ліку па прававых пытаннях, турысты і туркампаніі могуць атрымаць у спецыялістаў дэпартамента па турызме.

# ПЛЮС 760 МЛН ДОЛАРАЎ У ЭКВІВАЛЕНЦЕ

**Сродкі дзяржаўнага расійскага крэдыту ў памеры 760 млн долараў паступілі ўчора на рахунак Мінфіна Беларусі, паведамляе прэс-служба гэтага ведамства.**

Спецыялісты Мінфіна адзначаюць, што, згодна з міжурадавым пагадненнем, якое было падпісана 24 ліпеня ў Маскве, нашай краіне прадугледжана выдзяленне фінансавых рэсурсаў у расійскіх рублях на суму 760 млн долараў на тэрмін 10 гадоў, уключаючы чатырохгадовы льготны перыяд. Як паведамлялася, крэдыт прадастаўляецца для абслугоўвання і пагашэння крэдытаў, выдадзеных раней Беларусі Расіяй і Еўразійскім фондам стабілізацыі і развіцця.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ИООО «Датч Стар», опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...стоимость 1 кв. м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, ***1-комнатных квартир***, площадью *40,68* кв. м, ***1450*** (одна тысяча четыреста пятьдесят) долларов США, при единовременной 100% оплаты – ***1350*** (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США; ***3-комнатных квартир***, площадью *66,75 — 66,9* кв. м, ***1400*** (одна тысяча четыреста) долларов США, при единовременной 100% оплате – ***1350*** (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США; ***двухуровневых квартир***, общей площадью *135,41 — 139,81* кв. м, ***1100*** (одна тысяча сто) долларов США».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

# СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОТЛИЧНАЯ ИДЕЯ — ВЫИГРАТЬ 2!»

**1. СВЕДЕНИЯ ОБ ОРГАНИЗАТОРЕ**

Организатором Рекламной игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (далее – Организатор), зарегистрированное 24.04.2004 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 807000122. Лицензия на осуществление банковской деятельности №25 от 03.06.2013 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. Местонахождение Заинтересованного лица: 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, 11. УНП 80700012.

**2. СВЕДЕНИЯ О РЕКЛАМНОЙ ИГРЕ**

Рекламная игра носит название «Отличная идея – выиграть 2!» (далее — Игра) и проводится с 14 июня 2015 года по 31 июля 2015 года включительно (включая сроки выдачи призов и опубликования результатов проведения рекламной игры). Свидетельство о регистрации рекламной игры №2576 от 08.06.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Всего к участию в игре было допущено 10 567 участников, полностью соответствующих требованиям Правил Рекламной игры. Призовой фонд разыгран не полностью. Члены комиссии постановили: остаток призового фонда признать доходом ЗАО «Идея Банк».

**3. ПОБЕДИТЕЛИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ**

В соответствии с Правилами Игры победителями стали 5 участников:

| Победитель | Фамилия, инициалы победителя | Выигрыш | Дата выдачи |
|---|---|---|---|
| Победитель №1 | Полозова Инна Леонидовна | 3 636 120 (три миллиона шестьсот тридцать шесть сто двадцать) белорусских рублей | 23.07.2015 |
| Победитель №2 | Новорай Анжела Васильевна | 3 506 107 (три миллиона пятьсот шесть сто семь) белорусских рублей | 23.07.2015 |
| Победитель №3 | Дударева Наталья Анатольевна | 3 325 448 (три миллиона триста двадцать пять четыреста сорок восемь) белорусских рублей | 23.07.2015 |
| Победитель №4 | Сюрмаченко Александр Александрович | 1 699 132 (миллион шестьсот девяносто девять сто тридцать два) белорусских рубля | 23.07.2015 |
| Победитель №5 | Шидловская Анна Владимировна | 5 600 000 (пять миллионов шестьсот) белорусских рублей | 23.07.2015 |

Члены комиссии подтвердили, что розыгрыш проводился с соблюдением всех юридических норм и правил игры. Нарушений не было выявлено, жалоб организатору и комиссии не поступало.

Правила проведения рекламной игры, а также ее результаты, были опубликованы в газете «Звязда», № 109 от 11.06.2015 и №142 от 29.07.2015 соответственно.

**Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры + 375 (17) 306-33-14, 306-33-15, 7555 (для звонков с мобильных телефонов)**

## ПОЗДРАВЛЯЕМ ПОБЕДИТЕЛЕЙ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ТЫ – СЧАСТЛИВЧИК!»

Рекламная игра называется «Ты — счастливчик!», проведена в соответствии с условиями Правил, с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с Участников Игры платы.

Сроки проведения рекламной игры на территории Республики Беларусь – с 15 мая 2015 по 7 августа 2015 г. Сроки возможности принятия участия в рекламной игре – с 15 мая 2015 г. по 15 июля 2015 г.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2547 от 07.05.2015 г. выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

Правила рекламной игры были опубликованы в газете «Звязда» от 14 мая 2015 г.

Организатор рекламной игры ЗАО «Сэлмон-Графикс», 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, комн. 43, зарегистрированное решением Мингорисполкома от 2 декабря 2008 г., УНП 100843219.

В розыгрыше приняли участие 429 человек. Розыгрыш был проведен 27 июля 2015г. в соответствии с Правилами.

Призовой фонд рекламной игры был разыгран полностью.

А/м легковой Renault Sandero (новый) 2015 г.в.; 1,6 (бензин); цвет: лазурно-синий металлик; номер кузова: X7L5SRAVG52522416 + денежная сумма в размере 26 019 425 белорусских рублей выиграл: Пожарицкий Илья Андреевич.

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры (8-017) 216-80-77 в рабочие дни с 10.00 до 17.00.**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
### О СДАЧЕ В АРЕНДУ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск» Управления делами Президента Республики Беларусь, находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11, предлагает в аренду недвижимое имущество (помещения) арендуемой площадью 304 кв.м, на первом этаже капитального строения по просп. Независимости, 11, корп. 1 в г. Минске с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией.

Срок аренды – 3 года. Ставка арендной платы за 1 кв.м – 360 000 рублей. Целевое использование — помещения физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения (фитнес-центр (зал для размещения тренажеров), сауна, парная (хамам)).

Дополнительные условия и требования к арендатору при сдаче в аренду указанного недвижимого имущества (помещений) и его дальнейшего использования можно получить по телефонам для справок: **(8 017) 209-90-93, (8 029) 317 28 45.**

*УНП 100973184*

07 августа 2015 г. в 11.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лунинецлес».

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1) О довыборах членов совета директоров.
2) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Лунинецлес»: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

Место проведения собрания: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Первомайская, 56.

*Время регистрации в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.*

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 30.07.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

*УНП 200251040* Совет директоров

Утерянные страховые полисы ЗАСО «Белнефтестрах» по добровольному имущественному страхованию 2РП серии НС 15920 – 15929; добр. страхованию транспорта КА 4151 – 4160; добр. страхованию домашнего имущества ИД 6369 – 6378 считать недействительными. *УНП 101143603*

28 августа 2015 г. №3-А/2015

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды (лет) | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку докум-ции, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Объездная, 1 | 340100000005006839 | 0,0820 | для размещения станции технического обслуживания с участком покраски | Ограничений в использовании нет | 25 | 52 296 090 | 10 459 218 | 25 593 522 |
| 2 | ул. Кунцевича (район жилых домов 37, 39, 41) | 340100000004001309 | 0,1566 | для строительства и обслуживания магазина | Ограничений в использовании нет | 10 | 146 839 200 | 29 367 800 | 11 417 740 |
| 3 | район парка «Фестивальный» | 340100000006005093 | 0,3749 | для размещения веревочного парка | Ограничений в использовании нет | 5 | 352 155 645 | 70 431 129 | 26 645 913 |
| 4 | микрорайон № 21 (позиция № 33 по генплану) | 340100000001005836 | 0,1629 | для размещения здания кафе | Охранная зона сетей и сооружений канализации, водоснабжения, линий связи и радификации | 5 | 151 025 022 | 30 205 005 | 23 005 869 |
| 5 | район индивидуальной жилой застрой Романовичи (участок № 579 по генплану) | 340100000008003091 | 0,0810 | для строительства и обслуживаня одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | Охранная зона линий связи и радиофикации — 0,0041 га | 5 | 4 725 885 | 945 177 | 13 054 277 |
| 6 | ул. Оськина (район жилых домов № 28 и № 34, участок № 1) | 340100000007006758 | 0,0018 | для размещения легкотопного павильона бытового обслуживания населения (земельный участок для размещения объектов бытового обслуживания населения) | Ограничений в использовании нет | 5 | 1 099 098 | 219 820 | 17 582 294 |
| 7 | ул. Оськина (район жилых домов № 28 и № 34, участок № 2) | 340100000007006759 | 0,0018 | | Ограничений в использовании нет | 5 | 1 099 098 | 219 820 | 17 582 294 |
| 8 | ул. Оськина (район жилых домов № 28 и № 34, участок № 3) | 340100000007006760 | 0,0018 | | Ограничений в использовании нет | 5 | 1 099 098 | 219 820 | 17 582 294 |

1. Организатор аукциона — Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. №2-14).
3. **Аукцион состоится 28 августа 2015 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа — Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр". Наименование платежа — оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 — для возврата задатка для участия в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
Необходимые документы:
4.1 граждане — копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь — доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели — копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранногогражданина — легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляются в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в торгах принимаются государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 29 июля по 26 августа 2015 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.** Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14-00 до 14-40 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

**Контактный телефон: 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qorod.qomel.by**

■ Лёсы

# ДЗВЕ ВАЙНЫ АДНАГО РАЗВЕДЧЫКА

**У маі 1945-га фашысцкая Германія капітулявала. Толькі не ўсе салдаты Перамогі адразу вярнуліся ў родныя мясціны. Разам з кітайскай Народна-вызваленчай арміяй савецкія войскі змагаліся на тэрыторыі Кітая — працягвалася Другая сусветная вайна. Там, на Далёкім Усходзе, у разгроме Квантунскай арміі прымаў удзел і Аляксей Іванавіч Дзэцык. Яму і яшчэ 14 беларусам, якія ў 1945-м ваявалі з японцамі, Старшыня Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпін падчас свайго візіту ў нашу краіну асабіста ўручыў медаль Міру.**

— У Кітаі гэта вельмі высокая ўзнагарода, якую даюць толькі за выключныя дасягненні перад Радзімай, — кажа Аляксей Іванавіч. — Да чаго ж прыемна і нечакана было атрымаць яе тут, у Беларусі. Ды яшчэ з рук кіраўніка КНР!





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Перш чым перайсці да ўспамінаў пра вайну, Аляксей Дзэцык дазволіў патрымаць у руках медаль Міру, а таксама паказаў свой міні-музей, як ён яго сам называе. Гэта невялікі куточак у пакоі, які сведчыць аб актыўнай дзейнасці ветэрана: дыпломы, узнагароды, фотаздымкі... У свае 90 гадоў Аляксей Іванавіч не толькі наведвае шматлікія мерапрыемствы, але і з'яўляецца намеснікам старшыні Савета ветэранаў Кастрычніцкага раёна. Дагэтуль на працягу 22 гадоў узначальваў ветэранскую арганізацыю на «Інтэграле».

## НА АСАБЛІВЫМ УЛІКУ

Нарадзіўся Аляксей Дзэцык у вёсцы Андрэйкавічы, што ў Арлоўскай вобласці. Аднак сапраўднай малой радзімай, дзе прайшло ўсё яго дзяцінства, стала казахскае сяло Баладатнае. Маці памерла, калі яму было ўсяго два тыдні. Яе замяніла старэйшая сястра. «Нажуе хлеба з цукрам, пакладзе ў марлю — так мяне і карміць», — расказвае Аляксей Іванавіч.

У Казахстане скончыў школу. Адразу пасля 8 класа Аляксея Дзэцыка забралі ў войска, ва Узбекістан. Ішоў 1942 год. Сем месяцаў вучобы ў разведшколе — і на фронт. Трапіў у 277-ю стралковую дывізію 850-га палка. Яму не было і васямнаццаці...

— Разведчыкі, як і сапёры, памыляюцца толькі раз, — пераканаў Аляксей Іванавіч. — Часам ад іх залежаць сотні і нават тысячы выратаваных жыццяў. Разведка — вочы і вушы арміі. Мы знаходзіліся на асаблівым уліку. Ад своечасова атрыманай інфармацыі залежаў поспех любой аперацыі. У разведку на адным не хадзілі: пяць чалавек, дзесяць — глядзячы якое заданне. Бывае, дзень-два-тры сядзім у засадзе і нешта здабудзем. А часам тыдзень — і нічога.

## ШПІТАЛЬ — У ЦЯГНІКУ

— Самым складаным было захапіць «языка», — працягвае ветэран. — Добра, калі гэта будзе штабіст. Ён мог валодаць каштоўнымі звесткамі. Аднак злавіць штабіста — рэдкая ўдача. Заўсёды і ўсюды ён з аховай.

Гэта было ва Усходняй Прусіі. Разведчыкам пашчасціла захапіць нямецкага афіцэра, падпалкоўніка. Падчас допыту ён выдаў каштоўныя звесткі. «Языка» нават пераправілі ў Маскву. А разведчыкаў узнагародзілі. Так у Аляксея Дзэцыка з'явіўся першы медаль — «За адвагу». Пра іншыя подзвігі ветэрана нагадваюць медалі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй», «За перамогу над Японіяй», ордэн Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў.

Толькі не ўсе аперацыі разведчыкаў былі паспяховымі. На падыходзе да Кёнігсберга трапілі ў засаду. Аляксея Дзэцыка моцна параніла ў нагу. Таварышы ў палявы шпіталь неслі 15 кіламетраў. Апрацавалі рану — і ва Уфу, на лячэнне. Шпіталі былі перапоўнены. Параненых салдат у свае кватэры забіралі мясцовыя жыхары. «Дзеці нас увесь час падкормлівалі: то яечка прынясуць, то лаваш», — узгадвае франтавік.

У шпіталі Аляксей Дзэцык затрымаўся ненадоўга. Падрыхтавалі вагон, укамплектавалі яго медыцынскімі работнікамі — і больш-менш здаровых павезлі на фронт. Далечваліся на дарозе на Далёкі Усход.

## БАЯЛІСЯ КАМІКАДЗЭ

Аляксей Дзэцык вызваляў такія кітайскія гарады, як Мулін, Харбін, Гірын і іншыя. Шмат там загінула нашых салдат. І не столькі падчас баёў, колькі ад спякоты: не ўсе прыходзілі ў сябе пасля сонечнага ўдару. Днём было горача, а ноччу халадна. Ускладняў сітуацыю і рэльеф мясцовасці: то горы, то ямы. Бяда, калі ўпадзе конь: пазваночнік ламаецца напалам. Не ўсе жывёлы маглі пераадолець і водную перашкоду.

— Аднойчы наладзілі пераправу праз раку Мудадзян, — успамінае ветэран. — Нацягнулі вяроўку і пераправляліся на ёй на другі бераг. Думаў толькі аб адным: каб не параніла. Бо адразу б паляцеў уніз.

— А які вораг быў страшнейшы: немец ці японец? — пытаюся.

— Страшна было забіваць чалавека. Асабліва калі гэта рукапашная. Кожны хоча выжыць. У чалавека тады з'яўляецца неймаверная сіла. У японцаў была вельмі моцная разведка. А колькі сярод іх было смяротнікаў! Нават прыкаваныя да кулямётаў людзі сустракаліся. Такія ніколі не адступалі. Іх баяліся больш за ўсё.

## САМАЛЁТ СОЛІ

Як расказвае ветэран, кітайцы ніколі не казалі пра дрэннае. У іх заўсёды было ўсё добра — «шанго» па-кітайску.

— Кітайцы — дружны народ, — працягвае Аляксей Іванавіч. — Вельмі дапамагалі нам з харчаваннем. А самі жылі небагата. У асноўным займаліся сельскай гаспадаркай. Найбольш папулярнымі сельгаскультурамі былі чумізя і гальян. Чумізя падобная да проса, а гальян — як наша грэчка. І сёння памятаю: амерыканцы пастаўлялі тушонку. Вёдрамі. Якая ж смачная была! А японцы харчаваліся галетамі — булачкамі, тэрмін прыдатнасці якіх быў 10 гадоў. Кітайцы, напрыклад, не ўжывалі ў ежу соль. А мы без яе не маглі. Аднойчы спецыяльна для савецкіх салдат яе даставілі на самалёце «Лі-2».

## НА СЁМЫМ НЕБЕ АД ШЧАСЦЯ

Пасля вайны Аляксей Дзэцык застаўся ў войску. Служыў на розных пасадах у шматлікіх гарнізонах Савецкага Саюза. Затрымаўся ў Беларускай ваеннай акрузе. Можа, таму, што з беларускіх Крупак была жонка Вольга Елістратаўна. Пабраліся шлюбам на шосты дзень пасля знаёмства. Пражылі душа ў душу 60 гадоў. Выхавалі дзвюх дачок, дачакаліся ўнука.

— Шмат дзе быў, — гаворыць ветэран. — Толькі такога горада, як Мінск, не бачыў ніколі. Памятаю, калі ўжо пасля вайны адбудавалі нашу сталіцу, вельмі любіў прагульвацца пехам ад вуліцы Захарава да Галоўпаштамта. Паўсюль кветкі. Іду — і на сёмым небе ад шчасця.

Пасля дэмабілізацыі Аляксей Іванавіч уладкаваўся на «Інтэграл». Працоўны стаж ветэрана — 65 гадоў! І сёння франтавік не сядзіць без справы. Па чацвяргах — прыём насельніцтва ў савеце ветэранаў, у іншыя дні — мерапрыемствы, сустрэчы. Ды яшчэ трэба павіншаваць імяннікаў з Днём нараджэння: юбіляраў сёлета ў ветэранскай арганізацыі нямала. І кожнаму варта сказаць добрыя словы.

• • •

На развітанне мы зноў падыходзім да хатняга міні-музея. Аляксей Іванавіч паказвае фотаздымкі, расказвае пра апошнія сустрэчы з аднапалчанамі, дзеліцца планамі. Лаўлю сябе на думцы, што франтавая загартоўка — на ўсё жыццё. Інакш адкуль столькі сіл і аптымізму, якім нам, маладым, можна толькі пазайздросціць?!

**Вераніка КАНЮТА.** kanyuta@zviazda.by

■ Круглы стол: тэму прапанавалі гісторыкі

**Ёсць такія асобы, якіх смела можна назваць стаўпамі нацыянальнай гісторыі і культуры. Яны здолелі не проста пражыць жыццё, але пакінулі яскравы, добры след у мінулым. Да ліку такіх людзей можна аднесці Эдварда Вайніловіча. Як вялікі патрыёт, ён умела кансалідаваў вакол сябе ўсю тагачасную эліту. Актыўна падтрымліваў беларускую мову (не толькі ідэйна, але і фінансава), выступаў за еднасць усіх хрысціянскіх канфесій і гэтым таксама спрыяў кансалідацыі грамадства. Менавіта Эдвард Вайніловіч з'яўляецца фундатарам пабудовы касцёла Святых Сымона і Алены ў Мінску, які лічыцца адной з візітных картак сталіцы (у народзе яго называюць Чырвоным касцёлам). І гэта далёка не поўны спіс таго, што паспеў зрабіць за сваё жыццё гэты таленавіты чалавек.**

**Каб узгадаць традыцыі Эдварда Вайніловіча, паглядзець, які працяг яны маюць у сучаснасці, у «Звяздзе» адбыўся круглы стол, прысвечаны гэтай унікальнай асобе. У ім прынялі ўдзел дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, загадчык аддзела гістарыяграфіі і метадаў гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі Валянціна ЯНОЎСКАЯ, ксёндз-магістр, пробашч касцёла Св. Сымона і Алены Уладыслаў ЗАВАЛЬНЮК, загадчык аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі НАН Беларусі Андрэй УНУЧАК, дэкан факультэта перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Уладзімір ПУЦІК.**

Фота Надзеі БУЖАН.



Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.



Уладзімір ПУЦІК.



Валянціна ЯНОЎСКАЯ.



Уладыслаў ЗАВАЛЬНЮК.



Андрэй УНУЧАК.

# ЗЕРНІ ДАБРА І ПРАЎДЫ

### ЯК СЁННЯ ПРАЦЯГВАЮЦЦА ТРАДЫЦЫІ ЭДВАРДА ВАЙНІЛОВІЧА?



## ПАДТРЫМЛІВАЦЬ РОДНУЮ МОВУ

Добра вядома, што Эдвард Вайніловіч лічыў беларускую мову сваёй. У гэтага чалавека было столькі мудрасці і прадбачлівасці, што ён адным з першых са свайго асяроддзя падтрымаў ідэю беларускага нацыянальнага адраджэння. Адметным было тое, што, выступаючы за беларускую ідэю, ён непрыхільна ставіўся да радыкальных сацыялістычных настрояў. Вось што ён пісаў з гэтай нагоды:

*«Валодаючы беларускай мовай гэтак жа добра, як і польскай, і стала ўжываючы яе ў стасунках з вясковымі працаўнікамі ў сваёй гаспадарцы, я некалькі дзесяцігоддзяў падтрымліваў сталы кантакт з усімі праявамі беларускага руху перадусім у Менску... Беручы ў беларускіх згуртаваннях сякі-такі матэрыяльны ўдзел, урэшце мусіў з іх штораз выходзіць, бо распачатая ў іх праца, спачатку ў кірунку самапазнання і нацыянальнага адраджэння — «Лучынка», «Саха», «Загляне сонца і ў наша аконца», напрыканцы заўжды прымала сацыялістычныя кірунак і лозунгі, якім, насуперак сваім перакананням, служыць я не мог».*

**Андрэй Унучак:**

— Вывучаючы дзейнасць газеты «Наша Ніва» ў пачатку ХХ стагоддзя, я знайшоў дакументы, у якіх згадваецца, што для сябе асабіста Вайніловіч выпісваў адразу 10 асобнікаў газеты. Таксама ён выдзяляў пэўныя сродкі на падтрымку гэтага выдання.

У 1906 годзе ён выступіў з ідэяй аўтаноміі былога Вялікага Княства Літоўскага ў межах Расійскай імперыі. Таксама Вайніловіч быў за тое, каб беларуская мова (менавіта так яе называў) мела правы. Ён пісаў, што ўся наша шляхта, асабліва дробная, дома зазвычай размаўляе па-беларуску (гэта, дарэчы, пацвярджалі Аляксандр Сержпутоўскі і іншыя даследчыкі). Вайніловіч казаў, што ён быў знаёмы фактычна з усімі галоўнымі дзеячамі беларускага нацыянальнага адраджэння: братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі, Вацлавам Іваноўскім, Браніславам Эпімах-Шыпілам. Ён кантактаваў з тымі людзьмі, што выдавалі «Нашу Ніву» і заснавалі выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца». Вайніловіч казаў, што падтрымлівае беларускі нацыянальны рух да той мяжы, пакуль ён з'яўляецца нацыянальным і культурным рухам. Як толькі той пераходзіць у палітычнае рэчышча, ён дыстанцыруецца ад яго, бо гэта можа выліцца ў сацыяльную рэвалюцыю. У гэтым сэнсе ён быў паслядоўным.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Вельмі важны момант, што Вайніловіч, працуючы на кансалідацыю грамадства, быў супраць пашырэння варожасці. Гэта нагадвае нам, што і сёння трэба падтрымліваць сваю беларускую адметнасць, але ж пазбягаць канфрантацыі.

**Андрэй Унучак:**

— Вайніловіч добра ведаў гісторыю беларускай мовы. У адной з яго запісак за 1927 год ён падкрэсліваў, што Статут Літоўскі быў напісаны фактычна беларускай мовай і ўсе іншыя законы Вялікага Княства Літоўскага таксама пісаліся па-беларуску — гэта была мова ўрада. Ён адзначаў, што бачыў дакументы, датаваныя пачаткам XVIII стагоддзя (пасля забароны весці дзяржаўнае справаводства на старабеларускай мове ў 1696 годзе), напісаныя па-беларуску. Як палітычны мысліцель Вайніловіч разважаў так: «Калі аўстрыйцы, прусакі і руския «разабралі» Рэч Паспалітую, то аўстрыйцы ў сваёй антырасійскай палітыцы падтрымлівалі ўкраінцаў, дазваляючы ім развіваць сваю мову, культуру. Гэтак дзейнічалі і бальшавікі ў 1920-я гады ў адносінах да беларусаў і Польшчы. У Мінску ўзнік беларускі ўніверсітэт, іншыя ўстановы, беларуская мова фактычна стала дзяржаўнай. У той жа час на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая апынулася ў складзе Польшчы, беларуская мова паступова выціскалася з афіцыйнага ўжытку. Такім чынам, у канцы свайго жыцця Вайніловіч прадказваў паражэнне польскай палітыкі ў адносінах да «беларускага пытання».

**Уладыслаў Завальнюк:**

— Калі разважаць пра тое, якім чынам ён падтрымліваў беларускую мову, то, па-першае, як ужо згадвалася, фінансамі — выдаткоўваў сродкі на выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», на газету «Наша ніва». Па-другое, ён быў вядомай асобай — многія звярталіся да яго з просьбай дапамагчы выдаць тую або іншую кніжку, брашуру, і ён пагаджаўся. Аднак Вайніловіч не проста даваў грошы — ён гэтым жыў, жадаў, каб справа мела развіццё. Акрамя таго, ён быў вельмі бацькоўскім, сяброўскім у зносінах — у размовах з Вайніловічам гэта заўсёды адчувалася. Ён быў вельмі адкрытым — для людзей і з людзьмі.

## ПАВАЖАЦЬ УСЕ ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАНФЕСІІ

Эдвард Вайніловіч фундаваў пабудову касцёла Святых Сымона і Алены ў Мінску, які сёння з'яўляецца адным з архітэктурных упрыгажэнняў сталіцы. Ён вырашыў пабудаваць гэты храм, каб падкрэсліць еднасць усіх хрысціянскіх канфесій, аб'яднаць вернікаў. Вайніловіч пісаў пра гэта так:

*«...І выбраў для гэтага Мінск — горад, у якім я зрабіў найбольшую частку маёй грамадскай працы і ў якім будаўніцтва другой святыні было найбольш патрэбна. Пры тым хацеў, каб Мінск меў святыню, якая б мела пэўную своеасаблівасць... Я не жадаў спыняцца на гатычным стылі, па-першае, таму, што ён стаў вельмі распаўсюджаны на той час пры будаўніцтве каталіцкіх святынь у Расіі, па-другое, таму, што ён вельмі адрозніваўся ад стылю праваслаўных храмаў, якія існавалі ў нашым краі, і гэтым як бы падкрэсліваў падзел па веравызнанні класаў нашага грамадства, бо пераважная частка сялянства была праваслаўная, а землеўласнікі — каталікамі, і я спыніўся на раманскім стылі, росквіт якога прыпадае на час, калі ўсходняя Царква існавала ў еднасці з Рымам».*

**Валянціна Яноўская:**

— Варта прыгадаць, як будаваўся касцёл. З часу паўстання 1863-1864 гадоў да 1905 года касцёлы ў Беларусі ўвогуле не будавалі на тых месцах, дзе іх раней не было. Для таго каб узвесці новы касцёл, акрамя грошай, благаславення каталіцкага духавенства, выканання ўмоў будаўнічага статута, патрэбна была яшчэ і папярэдняя згода праваслаўнага епіскапа той епархіі, дзе меркавалася пабудаваць каталіцкі храм. Зразумела, што такой згоды амаль ніхто не даваў. Бо, як правіла, сцвярджалася, што насельніцтва вакол праваслаўнае і таму пабудова каталіцкага храма ў праваслаўным асяроддзі немэтазгодная. Размова магла весціся толькі пра тое, каб аднавіць колішні касцёл на старым месцы, але для гэтага трэба было даказаць, што ён там сапраўды быў. У 1904 годзе заканадаўства пачало пераглядацца. У красавіку 1905 года быў падпісаны ўказ аб асновах верацярпімасці. А ў маі таго ж года Вайніловіч ужо атрымаў дазвол на будаўніцтва новага касцёла, верагодна, ён быў адным з першых. Пры гэтым Вайніловіч паставіў умову, што сам будзе выбіраць архітэктурны стыль, майстра і сам фінансаваў будаўніцтва.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Давайце прыгадаем: колькі за савецкім часам было зруйнавана храмаў розных канфесій?.. Але Чырвоны касцёл захаваўся — гэта таксама сведчыць пра тое, што будаваўся, ствараўся ён з душою, з сапраўднай любоўю. Гэта энергія любові захавала яго, данесла да нашага часу. І сёння мы маем велічны храм, які з'яўляецца адной з візітовак сталіцы.

У абранні менавіта раманскага стылю для будаўніцтва касцёла (той стыль, які панаваў у той час, калі хрысціянская царква не была падзеленая) праявілася скіраванасць асобы Эдварда Вайніловіча на кансалідацыю грамадства.

**Уладыслаў Завальнюк:**

— Вайніловіч з'яўляўся поліканфесійным чалавекам, бо ў іх родзе былі праваслаўныя, каталікі, уніяты. Ён адзначаў, што ў сям'і ніколі не здаралася ніякага непаразумення ў поглядах, у тым ліку з прычыны веравызнання.



## ПРАВОДЗІЦЬ ПАЛІТЫКУ ЗДАРОВАГА СЭНСУ

Дыпламатычныя здольнасці гэтага чалавека ўражваюць — ён здолеў заваяваць прыхільнасць самых розных людзей. Прэм'ер-міністр Расійскай імперыі Пётр Сталыпін нават прапаноўваў Вайніловічу пасаду міністра сельскай гаспадаркі. Аднак наш суайчыннік адмовіўся ад такой прапановы і вырашыў да канца служыць свайму роднаму краю. У сваіх запісах ён неяк адзначыў:

*«Буду аднолькава незалежны як ад уплываў з-над Нявы і Масквы, так і ад указанняў з-над Віслы. Ніякіх мандатаў «imperatif» не прымаю. Буду, як і дагэтуль, ісці ў кірунку, які падкажа ўласнае сумленне і ўласнае разуменне патрэб свайго краю».*

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Не сакрэт, што Беларусь знаходзіцца на геапалітычным перакрыжаванні. Войны і канфлікты, якія здараліся ў Еўропе, так ці іначай закранalі нашу краіну. Тыя падзеі, якія адбываліся ў час жыцця Вайніловіча: нацыянальны беларускі рух, Першая сусветная вайна — прымушалі дзейнічаць у любых абставінах, што складваліся на той момант. Ён імкнуўся і падтрымліваць мясцовае насельніцтва, і супрацоўнічаць з уладнымі структурамі Расійскай імперыі, якія былі ў той час. Яго палітыка кампрамісу, здаровага сэнсу, на маю думку, вельмі слушная. Так, мы маем ўяўленне пра ідэальнае грамадства, у якім мог бы жыць Вайніловіч ці мы самі, але вымушаны дзейнічаць у тых палітычных, грамадскіх, сацыяльных, культурных умовах, што складваюцца ў канкрэтны гістарычны момант. Эдвард Вайніловіч акурат гэта добра разумеў.

**Уладзімір Пуцік:**

— Прынцыпова і тое, што ніхто не прызначаў яго на кіруючыя пасады ў грамадскіх і палітычных арганізацыях — гэтага яскравага чалавека заўсёды пераабіралі добраахвотна. Прыхільнікамі Вайніловіча былі землеўласнікі з тэрыторый сучасных Украіны, Беларусі, Польшчы і Літвы. У Дзяржаўным савеце Расійскай імперыі яго выбралі ў аграрную і эканамічную камісію (адну з самых важных). І калі ён браўся за справу, то абавязкова даводзіў яе да пэўнага бліскучага фіналу.

## ДАПАМАГАЦЬ СЛАБЕЙШЫМ

Эдвард Вайніловіч дбаў не толькі і не столькі пра ўласны дабрабыт. Пры ім у Мінскае сельскагаспадарчае таварыства — адну з найбуйнейшых недзяржаўных арганізацый таго часу — пачалі прымаць і сялян. Буйны памешчык Эдвард Вайніловіч надзвычай спачуваў ім. Да сваёй мары — духоўна адроджанай краіны, матэрыяльнага дастатку яе жыхароў — ён імкнуўся ўсімі сіламі:

*«Зерні дабра і праўды, кінутыя нашымі продкамі ў зямлю, узышлі і далі выдатны плён — усеагульны дабрабыт. Зараз здаецца гэта ўсё ясным і простым. Не, панове. Не з лёгкасцю быў дасягнуты такі вынік».*

**Уладзімір Пуцік:**

— Вайніловіч быў суперменеджарам. Ён узначальваў сельскагаспадарчае таварыства, і яно, бясспрэчна, было на высокім узроўні.

У сваіх «Успамінах» Вайніловіч падкрэсліваў, што за 25 гадоў дзейнасці таварыства многае змянілася. З 50—70 членаў у 1876 годзе яно вырасла да 700 чалавек у 1903 годзе. Замест людзей, што ўваходзілі ў таварыства толькі дзеля задавальнення свайго начальства, у арганізацыю прыходзілі тыя, хто прымаў і падзяляў ідэю дзейнасці таварыства і прынцыпы гонару, працы і праўды. У праграмных арыенцірах, згодна са статутам, адзначалася, што яно ствараецца дзеля збліжэння асоб, што займаюцца і цікавяцца сельскай гаспадаркай, дзеля садзеяння поспехам землеўладальніцкай прамысловасці, палёгкі ў збыце прадуктаў сельскай гаспадаркі.

Рабіліся спробы стварыць аддзяленні пры сельскагаспадарчых таварыствах, у якіх маглі прымаць удзел сяляне. Так, у гэты перыяд былі створаны аддзяленні Палескае, Слуцкае, Глускае, Навагрудскае, Бабруйскае, Мазырскае, Барысаўскае і іншыя. Віленскае сельскагаспадарчае таварыства на сваіх пасяджэннях неаднаразова разглядала «пытанні аб арганізацыі ў вёсках сельскагаспадарчых гурткоў, якія павінны быць заняты ў вырашэнні практычных праблем». У 1906 годзе пачалася праца па стварэнні сельскагаспадарчых гурткоў у Віцебскай і Гродзенскай губернях. На думку арганізатараў, яны павінны былі спрыяць уздыму сельскай гаспадаркі праз апеку сялянскіх гаспадарак.

**Андрэй Унучак:**

— Вайніловіч стварыў таксама таварыства ўзаемнага страхавання. Праз гэту арганізацыю дапамагаў утрымаць зямлю тым, хто мог яе страціць. Таксама з'явілася Клецкая ашчадная каса (або банк). Ён унёс туды шмат сваіх сродкаў. Для таго часу гэта было вельмі незвычайна. Прыязджалі з іншых гарадоў, і нават з Варшавы, каб паглядзець, як працуе Клецкі банк.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Мэтай Вайніловіча было не атрыманне прыбытку, а развіццё свайго краю, падтрымка іншых гаспадароў.

**Уладыслаў Завальнюк:**

— З гэтай нагоды варта прыгадаць словы Вайніловіча: «Я хачу, каб наш народ быў дастаткова багаты. Тады ён будзе і шчаслівы».

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Па сутнасці, ён імкнуўся да дзяржавы сацыяльнай справядлівасці, якую мы будуем сёння. Пра гэта кажа і наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «Спачатку парадак, потым рэформы», — гэта ключавы прынцып.

## СТВАРАЦЬ ДОБРУЮ АТМАСФЕРУ

Калі прааналізаваць жыццё і дзейнасць Эдварда Вайніловіча, можна зрабіць выснову, што галоўнае, што ім рухала, — гэта любоў да сваёй краіны і яе людзей. І гэтай любові нам таксама трэба ў яго павучыцца. Вось што ён пісаў пра суседзяў з Варшаўскага генерал-губернатарства, якіх царскі ўрад выселіў у Мінск:

*«Яны з уласцівай «караняжам» прэзумпцыяй лічылі сябе прызначанымі кіраваць жыццём нашай старонкі, нягледзячы на тое, што не ведалі яе ўмоў быту і не разумелі пэўных асаблівасцей грамадскага ладу, такога рознага ў Каралеўстве і Міншчыне, дзе вёска звычайна была іншай мовы і іншай веры, чым панскі двор».*

**Уладыслаў Завальнюк:**

— Вайніловіч жыў не сваім часам, а быў чалавекам як бы касмічным. Вельмі важна данесці да людзей дух гэтай унікальнай асобы. Дзеля таго распрацаваны маршрут «Слядамі Вайніловіча». Ён праходзіць праз Савічы, Слуцк, Капыль, Клецк — тыя мясціны, што звязаны з дзейнасцю Вайніловіча. Варта завітаць і ў яго маёнтак у Лапухах, што на Капыльшчыне. Там стаяць старажытныя муры, бачна веліч архітэктуры тых часоў. Усё выглядае досыць імпазантна.

Дарэчы, ёсць намер у Савічах цалкам аднавіць маёнтак Вайніловіча, ад якога на дадзены момант нічога не захавалася, адно старыя ліпы... Адзін прадпрымальнік, родам з Данецка, убачыўшы гэтыя мясціны, пачуўшы іх гісторыю, выказаў жаданне ўсё адрадзіць.

**Вячаслаў Даніловіч:**

— Той факт, што Эдвард Вайніловіч быў не толькі буйным землеўласнікам, але і чалавекам, які клапаціўся аб развіцці сельскай гаспадаркі на нашых землях, дае падставы арганізаваць, напрыклад, фестываль сельскай гаспадаркі імя Вайніловіча. На ім можна будзе паказваць мясцовыя гаспадаркі — і дзяржаўныя, і фермерскія — іх напрацоўкі на сённяшні дзень. Такая падзея змагла б стаць сапраўдным святам для пэўнага рэгіёна.

**Уладыслаў Завальнюк:**

— Мы плануем арганізоўваць сустрэчы на радзіме Вайніловіча — Капыльшчыне. Так, у мінулым годзе мясцовыя ўлады, даведаўшыся пра нашу ініцыятыву, адразу падключыліся, спыталі, чым могуць дапамагчы. Мы прапанавалі аднавіць могілкі (бо там ёсць курган Вайніловічаў), сказалі, што хочам, каб побач стаяла два крыжы — праваслаўны і каталіцкі. Неабходныя матэрыялы, сродкі выдзеліў райвыканкам, і ўсё было зроблена акурат так, як планавалася. Здавалася б, дзе той Вайніловіч з яго гісторыяй і дзе сучаснасць?.. Аднак да справы падключылася ўся Капыльшчына — яе жыхары надзвычай адкрытыя, жадаюць працаваць разам з намі. Там таксама зацікаўлены, каб імя Вайніловіча атрымала былое гучанне, каб гэтага чалавека больш ведалі ў Беларусі...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** nina@zviazda.by

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Диснейленд ближе с Милой»

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Парфюм Трейд» (Далее Организатор).

УНП 190805026. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 15.02.2007 г. № 294. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей (кроме представительства иностранной организации) № 190805026.

Местонахождение Организатора: Менковский тракт, 14, комната 107, Щомыслицкий с/с, район деревни Озерцо, 223021, Минская область, Минский район, Республика Беларусь.

Почтовый адрес: ул. Платонова, д. 34, ком.513, 220005, г. Минск.

**2. Наименование Рекламной игры.**

«Диснейленд ближе с Милой».

**3. Территория проведения.**

Сеть магазинов «Мила» на территории Республики Беларусь.

**4. Сроки проведения.**

01.08.2015 — 10.11.2015 (включая период розыгрыша и вручения призов).

**5. Состав комиссии по проведению Рекламной игры.**

Председатель:

1. Чувелева Ирина Витальевна, ООО «Парфюм Трейд», заместитель директора по маркетингу.

Члены комиссии:

1. Ходосок Елена Сергеевна, ООО «Парфюм Трейд», ведущий специалист по маркетингу.
2. Ланевская Анастасия Александровна, ООО «Парфюм Трейд», дизайнер.
3. Соколов Иван Сергеевич, ООО «Парфюм Трейд», специалист по прогнозированию и анализу деятельности предприятия.
4. Шевчук Алексей Александрович, ООО «Парфюм Трейд», аналитик/заместитель директора.
5. Максим Коновалов, Представительство в РБ АК «Colgate-Palmolive Temizlik Urunleri San.ve Tic.A.S.» Турция, Национальный менеджер по работе с ключевыми клиентами.
6. Михаил Прищепа, Представительство в РБ АК «Colgate-Palmolive Temizlik Urunleri San.ve Tic.A.S.» Турция, менеджер по работе с ключевыми клиентами.

**6. Перечень продукции, участвующей в Игре.**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования продаж продукции ТМ «Colgate», «Palmolive», «Mennen Speed Stick» и «Lady Speed Stick», реализуемой в сети магазинов «Мила».

**7. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится участником Рекламной игры.**

Участниками Рекламной игры могут стать физические лица – граждане Республики Беларусь, а также лица, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, достигшие 18 лет, выполнившие условия участия в Рекламной игре.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

Для участия в Игре необходимо в период с 01 августа 2015 года по 27 сентября 2015 года (включительно) совершить совокупность следующих действий:

1. Совершить покупку любых продуктов ТМ «Colgate», «Palmolive», «Mennen Speed Stick» и/или «Lady Speed Stick», на сумму от 99 900 бел. руб. в одном чеке в сети магазинов «Мила» на территории Республики Беларусь. Сумма 99 900 рассчитывается, исходя из розничной цены магазина, без учета скидок.
2. Сфотографировать чек, и сохранить до окончания Игры для дальнейшего предъявления его организатору, как подтверждающего документа.
3. Заполнить анкету участника на сайте milashop.by/disneyland/:
   - фамилию, имя, отчество;
   - возраст (полных лет);
   - город;
   - телефон для связи с указанием кода города либо кода мобильного оператора;
   - e-mail;
   - почтовый адрес, индекс;
   - адрес магазина «Мила», в котором совершена покупка;
   - дата и время совершения покупки;
   - загрузить фотографию чека.

Заполняя анкету на сайте Организатора, участники подтверждают факт ознакомления и полное согласие с правилами проведения данной Рекламной игры.

В Рекламной игре принимают участие покупатели, заполнившие анкету и загрузившие чек на сайте milashop.by/disneyland/ с 01.08.2015 по 27.09.2015. Организатор не несет ответственности за несвоевременное или некорректное предоставление информации, запрашиваемой в анкете участника, несоответствие чека данным Правилам или его отсутствие.

Определение участников Рекламной игры, соответствующих настоящим Правилам, производится по каждой анкете с прикрепленным чеком. Порядковые номера присваиваются после заполнения анкеты и загрузки чека на сайте milashop.by/disneyland/ в зависимости от времени регистрации участника на данном сайте.

В случае, если одно физическое лицо совершило несколько покупок, соответствующих настоящим Правилам, физическое лицо может регистрироваться в качестве участника Игры соответствующее количество раз. Из зарегистрированных анкет формируется список участников Игры в порядке, определенном регистрацией анкет на сайте (далее – Список участников).

Корректность и соответствие заполненных анкет данным правилам проверяется во время розыгрыша и определения победителей, на каждом этапе розыгрыша отдельно.

В случае выбора в качестве победителя не корректно заполненной анкеты либо чека, не соответствующего условиям участия в игре, – Организатор оставляет за собой право исключить такого участника из розыгрыша.

**8. Состав и размер призового фонда. Источники формирования.**

Источником формирования призового фонда является имущество и денежные средства Организатора. Общий размер призового фонда составляет: 121 749 096 (сто двадцать один миллион семьсот сорок девять тысяч девяносто шесть) белорусских рублей.

**Главный приз, участвующий в розыгрыше (приз первого уровня)**

| № | Наименование | Кол-во | Цена за 1 ед., бел. руб. с НДС | Всего, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Тур на троих в Париж на 3 ночи с 1 по 3 ноября 2015 г.<br>- страховка,<br>- авиаперелет Минск-Париж-Минск,<br>- трансфер, а/п-отель-а/п,<br>- проживание на троих в отеле KIRIADE, в трехместном номере,<br>- питание на троих Завтраки,<br>- визы,<br>- билеты в парк. | 1 | 44 095 336 | 50 554 336 |
| | Денежный приз | 1 | 6 459 000 | |
| Итого | | | | 50 554 336 |

**Призы второго уровня, участвующие в розыгрыше**

| № | Наименование | Кол-во, шт. | Цена за 1 ед., бел. руб. с НДС | Стоимость, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | LED телевизор Philips 40PFT4509/60 | 3 | 6 761 000 | 22 923 900 |
| | Денежный приз | 3 | 880 300 | |
| 2 | Планшет Samsung Galaxy Tab4 7.0 (SM-T231NYKASER, 3G, Черный) | 5 | 4 123 000 | 23 045 500 |
| | Денежный приз | 5 | 486 100 | |
| 3 | MP3-плеер Sony NWZ-E384B черный | 5 | 1 667 000 | 8 930 500 |
| | Денежный приз | 5 | 119 100 | |
| Итого | | | | 54 899 900 |

**Призы третьего уровня, участвующие в розыгрыше**

| № | Наименование | Кол-во, шт | Цена за 1 ед. бел. руб. с НДС | Стоимость набора, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Набор товаров ТМ «Colgate», «Palmolive», «Mennen Speed Stick» и «Lady Speed Stick»:<br>1. Palmolive гель для душа для мужчин Гроза (Глубокое очищение), 250 мл;<br>2. Colgate Plax ополаскиватель для полости рта Свежесть чая, 250 мл;<br>3. Colgate щетка зубная Сосна с натуральными экстрактами;<br>4. Palmolive мыло туалетное Натурэль Алтайские травы (фиолет), 90 г;<br>5. Lady Speed Stick дезодорант-антиперспирант Fresh and Essence Perfect Look арбуз спрей, 150 мл;<br>6. Palmolive мыло туалетное твердое Натурэль Баланс и Мягкость с экстрактом ромашки и витамина Е, 175 г;<br>7. Colgate паста зубная Total 12 Pro-Gum Health (Pro-Здоровье Десен), 75 мл;<br>8. Colgate паста зубная Gentle Whitening/Бережное отбеливание, 100 мл;<br>9. Palmolive гель для душа Термал СПА Массаж, 250 мл;<br>10. Mennen Speed Stick дезодорант Энергия Стихии Молния для мужчин в карандаше, 60 г;<br>11. Colgate щетка зубная Тройное действие;<br>12. Lady Speed Stick дезодорант-антиперспирант Свежесть облаков, 45 г;<br>13. Palmolive мыло туалетное твердое Натурэль Интенсивное увлажнение с экстрактом оливы и увлажняющим молочком, 5х70 г | 50 | 325 897,2 | 16 294 860 |
| Итого | | | | 16 294 860 |

**9. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения выигравших участников Рекламной игры.**

**9.1 Место, дата и время проведения розыгрыша.**

Розыгрыш призов состоится 1 октября 2015 года в 12.00 по адресу г. Минск, ул. Платонова, 34, комната 318 (3-й этаж).

**9.2 Порядок проведения розыгрыша.**

К моменту розыгрыша данные об участниках Рекламной игры формируются Организатором в Список Участников. Порядковые номера присваиваются после заполнения анкеты и загрузки чека на сайте milashop.by/disneyland/ в зависимости от времени регистрации участника на данном сайте.

Для проведения розыгрыша используются лототрон и набор карточек в количестве, равном количеству присланных анкет с порядковыми номерами.

Каждая зарегистрированная анкета участника оформляется в одну карточку Участника, которая содержит порядковый номер Участника. Карточки распечатываются, засыпаются в лототрон, перемешиваются, затем один из членов комиссии вынимает карточки в количестве и порядке, соответствующем количеству победителей в розыгрыше.

За ходом розыгрыша призов следит комиссия по проведению Игры. Итоги розыгрыша призов Игры фиксируются в Протоколе комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами комиссии.

**Порядок проведения розыгрыша.** Определение выигрышных номеров получателей призов происходит путем случайного вытаскивания карточек из барабана.

В розыгрыше будут разыграны следующие призы в указанной последовательности:

1. 50 призов третьего уровня: набор товаров ТМ «Colgate», «Palmolive», «Mennen Speed Stick» и «Lady Speed Stick»,
2. 5 призов второго уровня: MP3-плеер Sony NWZ-E384B черный и денежный приз,
3. 5 призов второго уровня: планшет Samsung Galaxy Tab4 7.0 (SM-T231NYKASER, 3G, Черный) и денежный приз,
4. 3 приза второго уровня: LED телевизор Philips 40PFT4509/60 и денежный приз,
5. **Главный приз (приз первого уровня):** тур на троих в Париж на 3 ночи с 1 по 3 ноября 2015 г. и денежный приз.

Выдача призов происходит за вычетом денежных средств, необходимых на уплату подоходного налога.

**10. Срок и способ информирования участников, выигравших призы, место, порядок и сроки выдачи призов.**

Победители Рекламной игры, выигравшие призы третьего уровня, извещаются о выигрыше по электронной почте, а также почтовым уведомлением на указанные в анкете участника адреса до 15 октября 2015 года.

Победители Рекламной игры, выигравшие главный приз, а также призы второго уровня, извещаются о выигрыше заказным письмом с уведомлением, высланным по указанному в анкете участника почтовому адресу до 15 октября 2015 года.

Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на указанные при регистрации на интернет-сайте номера сотовых телефонов операторов, по электронной почте, звонком по телефону.

Победители могут получить призы при предъявлении паспорта (вида на жительство и т. п. документов, подтверждающих личность победителя и/или его доверенного лица при предъявлении соответствующей доверенности), а также кассового чека за приобретение товара, участвующего в рекламной игре в офисе Организатора по адресу: ул. Платонова, 34, каб. 303, до 10 ноября 2015 г. с 10.00 до 16.00 в рабочие дни.

Победитель, выигравший главный приз, обязуется до 19 октября 2015 г. предъявить подарочный сертификат в турагентстве ООО «22ПАРАЛЛЕЛЬ» по адресу: г. Минск, ул. Революционная 8, 1-й этаж.

В случае отказа победителя от получения приза или неполучения приза в установленные сроки и в установленном порядке победитель теряет право на получение приза, и приз данного победителя остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

Выплата денежного эквивалента стоимости приза или замена его на другой приз не допускается.

Участники Игры, претендующие на получение призов, обязуются: заполнить и подписать все необходимые для их получения документы, предоставляемые Организатором, предоставить Организатору необходимые сведения. В случае невыполнения указанного условия Организатор имеет право отказать в выдаче призов.

В соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь при выдаче призов Организатор удерживает и перечисляет подоходный налог с суммы приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Организатор самостоятельно исчисляет и удерживает из суммы денежной части главного приза и приза 2 уровня сумму подоходного налога победителя. Главный приз и призы 2 уровня выдаются победителям за вычетом денежного приза, идущего в уплату налогов.

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения и заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором и связанные с получением приза.

Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках Игры их имена, отчества, фамилии, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в целях проведения Рекламной игры.

Все права, в т. ч. исключительные имущественные права на такие интервью и результаты съемки, будут принадлежать Организатору.

**11. Название печатного средства массовой информации, в котором будут опубликованы результаты розыгрыша призового фонда, а также сроки их опубликования.**

Настоящие правила подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

Результаты подлежат опубликованию в газете «Звязда» — 07.10.2015 года.

**12. Общие условия Рекламной игры.**

Принимая участие в Рекламной игре, участник подтверждает свое ознакомление и согласие с Правилами и со всеми условиями участия в Рекламной игре.

Налогообложение призов производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Рекламной игры, а также результаты проведения Рекламной игры будут считаться окончательными и будут распространяться на всех участников.

Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону «горячей линии» (8017) 331-97-54, 211-36-16 с 10:00 до 17:00 в рабочие дни, а также на сайте www.milashop.by/disneyland.

*Свидетельство о государственной регистрации правил рекламной игры «Диснейленд ближе с Милой» №2592 выдано Министерством торговли Республики Беларусь 08 июля 2015.*

## РЭСПУБЛІКАНСКІ СПІС ЭКСТРЭМІСЦКІХ МАТЭРЫЯЛАЎ

| Від інфармацыйнай прадукцыі | Найменне, аўтар, вытворца інфармацыйнай прадукцыі | Найменне суда, які вынес рашэнне, і дата ўваходжання ў сілу рашэння суда |
|---|---|---|
| CD-R дыскі | «Урок Беларускае мовы»;<br>«Канцэрт «Салідарныя зь Беларусьсю» на рынкавай Плошчы Новага Горада ў Варшаве 12 сакавіка 2006»;<br>«MEGAUS MEG 16753» (канфіскаваны ў гр-на Буракова Аляксандра Уладзіміравіча) | Рашэнне суда Кастрычніцкага раёна г. Гродна ад 4 верасня 2008 года, увайшло ў законную сілу 16 верасня 2008 года |
| Кніжныя выданні | «Нет плохих народов», Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2007 г., 127 с.;<br>протаіерэй Алег Чакрыгін «Читая Евангелие. Размышления на евангельские чтения. Кто мы: христиане или иудеи?», Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2005 г., 95 с. (7-е выданне);<br>Ерчак В.М. «Слово и Дело Ивана Грозного», Мінск, ФУА Информ., 2005 г. 704 с.;<br>«Россия пробудись. В защиту Отечества», складальнік ігумен Сімяон, Масква, «Империум-Пресс», 2005 г., 384 с.;<br>Платонаў А.А. «Тайное мировое правительство», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.;<br>Платонаў А.А. «Загадка Сионских протоколов», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.;<br>Платонаў А.А. «Русское сопротивление», серыя «Война с антихристом», Масква, «Алгоритм», 2006 г.;<br>Платонаў А.А. «Война с внутренним врагом», серыя «Заговор против России», Масква, «Алгоритм», 2006 г.;<br>Барыс Міронаў «Иго иудейское», Масква, «Алгоритм», 2007 г.;<br>Мікалай Жэвахаў «Еврейская революция», серыя «Проект Олега Платонова «Русское сопротивление», Масква, «Алгоритм», 2006 г.;<br>«Убиение Андрея Киевского. Дело Бейлиса — «смотр сил», Мінск, «Русская идея», 2006 г.;<br>Філімонаў В.П. «Время суда», Мінск, ЗАТ «Христианская инициатива», у 2-х тамах, 2007 г.;<br>«Исследование Холокоста. Глобальное видение. Материалы международной Тегеранской конференции», Масква, «Алгоритм», 2007 г., 272 с. | Рашэнне суда Савецкага раёна г. Мінска ад 19 снежня 2008 года, увайшло ў законную сілу 26 лютага 2009 года |
| Кніжнае выданне | «Приговор убивающим Россию», Барыс Міронаў, Мінск, ЗАТ «Православная инициатива», 2005 г. | Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 8 ліпеня 2009 года |
| Кніжнае выданне | «Особое мнение, или Обращение христианки», Алена Гнаук, Брэст, 2011 г. | Рашэнне суда Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ад 16 лістапада 2011 года, увайшло ў законную сілу 27 лістапада 2011 года |
| Друкаванае выданне | «Прэс-фота Беларусі-2011», выдавец: ІП Логінаў, надрукавана: Taurapolis, Каўнас, Літва, 159 с. | Рашэнне суда Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці ад 18 красавіка 2013 года, увайшло ў законную сілу 24 чэрвеня 2013 года |
| Кніжнае выданне | «ВЕЛЕС — БОГ РУССОВ». Неизвестная история русского народа / А.І. Бялоў. — 4-е выд. — М.: Амрита, 2012. — 272. | Рашэнне суда Маскоўскага раёна г. Брэста ад 10 студзеня 2014 года, увайшло ў законную сілу 21 студзеня 2014 года |
| Друкаваныя выданні | Ас-Сухеймі, Саліх. Основы веры в свете Корана и Сунны / пер. з араб. Э. Куліева. — 3-е выд., выпраўл., дап. — М.: Выдавец Эжаеў, 2008. — 304 с.;<br>Куліеў, Эльмір. На пути к Корану. — 3-е выд., выпраўл. — М.: Выдавец Эжаеў, 2008 — 560 с.;<br>Рабі Хадзі аль-Мадхалі. Мудрость и логика в методах призыва пророков к Аллаху / 1-е выданне. Пераклад з арабскай Куліева. — М.: Выдав. дом «БАДР», 2000 — 152 с.;<br>Мухамад Салех. Как ответить на три основные вопроса / Першае выданне, 2010. — 250 с. (капірайт www.Svet-Islama.com);<br>Захарна С.Н. Тяжкие последствия актов самоубийства. — Кувейт, 2005. — 128 с. Капірайт — Общество «Возрождения Исламского Наследия»;<br>Абдуль Азіз Ар-Райіс. Нарушение единобожия. — 2008. — 130 с.;<br>Аліхан Мусаеў. 10 прав. — 28 с.;<br>Вероубеждение мусульманина. — 11 с. | Рашэнне суда Фрунзенскага раёна г. Мінска ад 12 сакавіка 2014 года, увайшло ў законную сілу 24 сакавіка 2014 года |
| Кніжныя выданні | Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў цвёрдым пераплёце, 848 с.;<br>Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў мяккай вокладцы, 848 с.;<br>Alan Bullock. Hitler, A Study In Tyranny. Кніга ў мяккай вокладцы, 848 с.;<br>Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга ў цвёрдым пераплёце, 384 с.;<br>Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга ў мяккай вокладцы, 384 с.;<br>Adolf Hitler. Mein Kampf. Кніга 694 с.;<br>George L. Mosse. Nazi Culture. Кніга 386 с.;<br>George Lincoln Rockwell. This Time the Wolrd. Кніга 264 с.;<br>George Lincoln Rockwell. White Power. Кніга 466 с.;<br>Soldier's Manual for MOS 11C — Indirect Fire Infantryman: Skill level 1. Кніга 516 с.;<br>Soldier's Manual, MOS 11C, Indirect Fire Infantryman: Skill level 2/3/4». Кніга 900 с. | Рашэнне суда Бабруйскага раёна і г. Бабруйска ад 17 лютага 2015 года, увайшло ў законную сілу 28 лютага 2015 года |
| Інфармацыйныя матэрыялы | размешчаны на інфармацыйным рэсурсе ў сетцы Інтэрнэт (URL https://vk.com/id210277702) | Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года |
| Інфармацыйныя матэрыялы | размешчаны на інфармацыйных рэсурсах у сетцы Інтэрнэт (URL https://vk.com/psh_soc; https://vk.com/psh_info; https://twitter.com/psh_eco; https://facebook.com/psh.by) | Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года |
| Відэаматэрыялы | размешчаны на інфармацыйных рэсурсах у сетцы Інтэрнэт (URL https://www.youtube.com/watch?v=qF-wX10MHKU; https://www.youtube.com/watch?v=FJRN6k1wzag; https://www.youtube.com/watch?v=jn7pgkcoY60; https://www.youtube.com/watch?v=2vjNW5g4Yfc) | Рашэнне суда Цэнтральнага раёна г. Мінска ад 30 чэрвеня 2015 года, увайшло ў законную сілу 13 ліпеня 2015 года |


**РУП «Институт недвижимости и оценки»** (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Дабрабыт» (Продавец) проводит повторный открытый аукцион со снижением цены по продаже амбулатории (инв. №621/С-47455) площадью 157,2 м² и гаража (инв. 621/С-47456) площадью 52,7 м², расположенных по адресу: Минская обл., Несвижский р-н, Ланский с/с, аг. Лань, ул. Советская, 75А.

Земельный участок площадью 0,1093 га с кадастровым номером 624282003601000315. Целевое назначение — обслуживание здания амбулатории. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена с НДС – 131 051 520 бел. руб. Задаток с НДС – 13 105 152 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Дабрабыт», проводимом 27 августа 2015 г.

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 5% (пять процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 27.08.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 26.08.2015 до 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.04.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

☎ **Дополнительная информация: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
### извещает об открытом аукционе по продаже здания конторы и гаража ОАО «МЭТЗ им. В.И. Козлова»

| Лот №1 | Здание конторы и гаража | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Нововетреная, 11А | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток с НДС, руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2 395 200 000 | 71 856 000 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

1. Здание конторы с инв. №350/С-78596. Назначение — здание административно-хозяйственное. Г.п. – до 1917. Этажей – 1. Площадь застройки/общая — 207 кв. м/238,8 кв. м. Фундамент – кирпичный. Стены – бревна. Перегородки, перекрытия чердачные, полы – дощатые. Крыша – металлическая. Проемы оконные, дверные – деревянные. Наружная отделка стен – обшито досками. Отопление – центральное. Канализация – чугунные трубы. Электроснабжение – открытая проводка. Водопровод – металлические трубы. Радио, телефон – каблировано. Составные части и принадлежности: мезонин, две каркасно-засыпные пристройки, подвал, сход в подвал, крыльца, забор, проезжая часть.
2. Здание гаража с инв. №350/С-78786. Назначение — здание специализированное автомобильного транспорта. Г.п. – до 1995. Этажей – 1. Площадь застройки/общая – 101 кв. м/89,8 кв. м. Фундамент – ж/б блоки. Стены – блоки ПГС. Перегородки – дощатые. Перекрытия чердачные – сборные ж/б плиты. Полы – бетонные. Крыша – совмещенная. Проемы дверные – металлические. Наружная отделка стен – без отделки. Электроснабжение – открытая проводка. Вентиляция – естественная.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Здание гаража с инв. №350/С-78786 сдается по договору аренды на срок до 30.06.2018.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,1376 га с кадастровым номером 340100000001000012. Целевое назначение — содержание и обслуживание административного здания Гомельского хозрасчетного ремонтно-строительного участка. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), — Претендент на покупку должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (Трех процентов) от цены продажи Объекта в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 31.08.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже здания конторы и гаража ОАО «МЭТЗ им. В.И. Козлова», проводимом 31 августа 2015 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приема заявлений 27.08.2015 в 10.00.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта: Барсуков Александр Сергеевич 8 (029) 616-74-05.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 306-00-59, 8 (029) 356-90-03 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**



**«ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» — управляющий по делу о банкротстве ЗАО «ИНТЕРИНВЕСТ» — извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику.**

Торги состоятся 13 августа 2015 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 3.

Для участия в торгах необходимо подать до 10 августа 2015 года заявку и перечислить на расчетный счет ЗАО «ИНТЕРИНВЕСТ» 3012200620014 в ОАО «Паритетбанк», г. Минск, код 782, УНП 100165919 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.

С имуществом, выставляемым на торги, можно ознакомиться по его месту нахождения: г. Минск, пер. Козлова, д. 7, пом. 21, предварительно согласовав время с управляющим. Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220053, г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 3.

Сведения об имуществе, выставляемом на торги.

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение паркинга, машино-место № 7, № 8 | 157 978 080 | 7 898 904 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

**С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел.: +37517 388 03 25, +37529 342 18 42.**



ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» сообщает о начале процедуры реорганизации в форме присоединения УПП «НОМ» и возникновении права требования выкупа акций по номинальной стоимости в срок до 12.09.2015. УНП 500021638



**Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по**:
- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 13 августа 2015 в 11.00** состоятся ПОВТОРНЫЕ открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности Республиканскому государственно-общественному объединению «Белорусское республиканское общество спасения на водах» (продавец), в составе:

| | Лот № 1 (предмет торгов) | Лот № 2 (предмет торгов) |
|---|---|---|
| | Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-70112 (здание неустановленного назначения), общей площадью 176,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, пер. Затонный, 2А | Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 710/U-70113 (здание неустановленного назначения), общей площадью 273,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, пер. Затонный, 2А |
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, ул. Чапаева, д. 4, 220034, г. Минск к.222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369 | |
| **Продавец предмета торгов** | Республиканское государственно-общественное объединение «Белорусское республиканское общество спасения на водах», УНП 100094953 ОКПО 00021545, пер. Обойный, 6, 220004, г. Минск, р/с 3015000213815 в ЦБУ № 538 г.Минск ОАО «Белинвестбанк» БИК 153001739, ул. Коржа, 11а | |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 | |
| **Общие сведения** | Лот № 1 | Лот № 2 |
| **Начальная цена продажи** | 226 400 000 рублей с учетом НДС | 256 800 000 рублей с учетом НДС |
| **Размер задатка** | 5% от начальной цены – 11 320 000 рублей | 5% от начальной цены – 12 840 000 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа —** Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, УНП 102353509 | |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 741000000009000730, площадь земельного участка для обслуживания здания — 0,0586 га. Имущественные права на земельный участок – право аренды | Земельный участок с кадастровым номером 741000000009000730, площадь земельного участка для обслуживания здания — 0,1303 га. Имущественные права на земельный участок – право аренды. |
| **Характеристика предмета торгов** | Здание двухэтажное, фундамент – ж/бетон.блоки, стены и перегородки — ж/бетон. панели,перекрытия — ж/бетонное; кровля – шифер; полы и проемы отсутствуют, степень готовности — 51%, инженерные коммуникации отсутствуют. Здание можно использовать под жилье, расположено на берегу р. Березина. Хорошо развита инфраструктура | Здание одноэтажное кирпичное, фундамент – ж/бет. блоки, перекрытия — ж/бетонное; кровля, полы и проемы – отсутствуют, степень готовности — 50%, инженерные коммуникации отсутствуют. Здание можно использовать под склад или производственный цех, расположено на берегу р. Березина. Хорошо развита инфраструктура |
| **Условия продажи предмета торгов** | Без условий | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов | |
| **Сроки и условия оплаты** | 50% стоимости по лотам – одноразовым платежом в течение календарного месяца, оставшаяся сумма допускается в рассрочку от 3 до 6 месяцев | |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | по 10 августа 2015 г. включительно до 16.00 | |

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 (трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 10 июня 2015 г.

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54, или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30**

**Уладзімір ДРАЖЫН:**

# «ГОЛЬФ — ГЭТА СУМЛЕННА!»

## У 2020 ГОДЗЕ МЫ ЎБАЧЫМ НА АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯХ І НАШЫХ СУАЙЧЫННІКАЎ-ГАЛЬФІСТАЎ

### Старшыня асацыяцыі гольфа пра тое, ці ёсць умовы для яго развіцця ў нашай краіне

**«Гульня для багатых», «вольны час дыпламатаў», «забавы для мільянераў»... За сваю стагадовую гісторыю гольф здабыў мноства эпітэтаў, нават стэрэатыпаў. А тым часам ужо ў наступным годзе гэты від спорту будзе прадстаўлены на XXXI Летніх Алімпійскіх гульнях у Бразіліі. Гэта дае падставу разабрацца ў праўдзівасці выказванняў пра гольф, звярнуць увагу на развіццё гульні ў нашай краіне і падумаць пра перспектывы беларускіх спартсменаў на галоўным старце чатырохгоддзя. Для гэтага мы сустрэліся са старшынёй Беларускай асацыяцыі гольфа Уладзімірам ДРАЖЫНЫМ, у нядаўнім мінулым палітыкам і дыпламатам.**

— Гольф — гэта адзін з самых элегантных відаў спорту, магчымасць весці актыўны лад жыцця і адначасова быць у гармоніі з прыродай. Бо гольф-палі — гэта спартыўныя збудаванні, якія арганічна ўпісаны ў прыроду; гэта і рака, і возера, і лес, — пачынае свой расказ з захапленнем Уладзімір Несцеравіч. — Акрамя таго, гэта спорт з кодэксам гонару, там цябе ніхто не кантралюе, ты бярэш свой мяч, робіш на ім пазнаку і з гэтым мячом, прайшоўшы 18 лунак, вяртаешся на зыходную пазіцыю. Твае страты і ўдары не адсочваюцца суддзёй, усё на сумленні спартсмена.

***— У большасці краін свету гольф — гэта ўжо даволі папулярная гульня. Што ён уяўляе сабой у нас?***

— Мы робім толькі першыя крокі па развіцці гольфа ў нашай краіне. Вядома, дзяржавы Еўропы, Расія і нават Казахстан ужо прайшлі пэўны шлях і маюць добрую гольф-інфраструктуру. Сёння мы вымушаны іх даганяць. У першую чаргу — прыцягваць людзей і будаваць гольф-клубы. У нас у краіне пакуль толькі адзін гольф-клуб — «Мінск».

Яшчэ ў 2012 годзе ў краіне была створана федэрацыя, але, на жаль, яна не займалася работай, якая называецца «масавае развіццё віду спорту». У асноўным вяла месячковы лад існавання. Калі я вярнуўся з-за мяжы, паступіла прапанова ўзначаліць асацыяцыю гольфа ў Беларусі, у якую ўваходзяць федэрацыі прафесіяналаў і аматараў гольфа, а таксама міні-гольфа. Я разумею, што трэба пачынаць маштабную працу.

***— І з чаго пачалі?***

— У першую чаргу трэба было стварыць агульную сістэму, была падрыхтавана стратэгія развіцця гольфа ў Беларусі, пазней зацверджаная ўрадам. Першая ступень — гэта, вядома, дзіцяча-юнацкі гольф, бо спорт — аснова сацыяльнай палітыкі і здароўя нацыі. Таму мы вырашылі, што гольф павінен пачынацца са школы і пераходзіць у гімназіі, каледжы і далей — у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Сёння працуем над тым, каб магчымасць займацца гольфам атрымлівалі як мага больш людзей. Думка пра тое, што гэта дарагі і выключна элітарны від спорту, няправільная. Калі мы гаворым пра дзіцячы спорт, то сёння ёсць методыкі навучання першапачатковым відам гольфа — гэта шорт-гольф. Купляецца камплект, у які ўваходзіць 10-20 мячоў, 6-10 клюшак, мішэні, і ў крытай спартзале, якая ёсць у кожнай школе, дзеці атрымліваюць першапачатковыя навыкі. Гэта не патрабуе вялікіх выдаткаў.

Яшчэ адна магчымасць далучыцца да гольфа — міні-гольф-пляцоўкі. На тэрыторыі паўгектара ствараецца 18 дарожак, на якіх пабудаваны штучныя перашкоды для мяча. Далей можна пераходзіць да паўнавартаснай трэніровачнай палі.

Таксама мы ставім перад сабой задачу пабудаваць па адным чэмпіёнскім і адным трэніровачным гольф-полі ў кожнай вобласці плюс яшчэ адзін комплекс у Мінску. Адпаведна, там з'явяцца і гольф-клубы.

У абласных цэнтрах і гарадах з насельніцтвам больш за 30 тысяч мы плануем увесці ў эксплуатацыю 33 пляцоўкі для гульні ў міні-гольф, а потым яны з'явяцца і ў раённых цэнтрах. Такім чынам, да 2020 года мы можам дасягнуць такіх вынікаў, што гольфам тэарэтычна будзе займацца кожны 10-ты беларус.

Не варта забываць, што развіццё такога віду спорту спрыяе паляпшэнню іміджу краіны на міжнароднай арэне, прапагандзе здароўя і актыўнага ладу жыцця для ўсіх слаёў і ўзростаў насельніцтва, развіццю гольф-турызму і вырашэнню многіх іншых сацыяльных і эканамічных аспектаў жыцця нашай дзяржавы.

***— Хто можа навучыць дзяцей гульні ў гольф — спецыялістаў, як я разумею, у нас няшмат?***

— Усё так, да 2020 года для паўнамаштабнай рэалізацыі праграмы развіцця гольфа неабходна забяспечыць падрыхтоўку кадравага патэнцыялу трэнерскага складу, суддзейскага корпуса, спецыялістаў у галіне гольф-менеджменту і кіравання гольф-клубамі. Цэнтрам гэтай працы мы бачым Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, дзе з 1 верасня 2015 года плануецца стварэнне кафедры гольфа для падрыхтоўкі трэнераў і суддзяў, а таксама Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі.

Асацыяцыя плануе арганізацыю рэгулярнай адукацыйнай дзейнасці ў гарадах і раёнах. У прыватнасці, праваджэнне семінараў і канферэнцый па правілах гульні, суддзейства і іншых напрамках.

***— Што сабой уяўляюць гольф-клубы?***



— Паўнавартасны гольф-клуб павінен мець клубны дом, дзе наведвальнік змог бы камфортна адпачыць і арганізаваць дзелавыя сустрэчы, гольф-акадэмію для азнаямлення са структурай заняткаў, тэарэтычнай падрыхтоўкай, гасцявыя дамы, а таксама акадэмічнае поле з аб'ектамі для трэніровак.

***— Усім вядома, што з 2016 года гольф уключаны ў алімпійскую праграму. Калі мы зможам убачыць там беларусаў?***

— Цяперашні цыкл мы, вядома, прапускаем, таму што маем на сёння невялікую колькасць спартсменаў у гэтым відзе. Але запэўніваю, у 2020 годзе мы ўбачым на Алімпійскіх гульнях суайчыннікаў. Таму што падрыхтоўку мы вядзём ужо цяпер.

***— Хто гуляе ў гольф сёння ў Беларусі?***

— Гэта людзі маладога і сярэдняга ўзросту, якія працуюць у зусім розных галінах, а таксама ўсё больш дзяцей мы бачым на гольф-пляцоўках. Гэта радуе. Мы маем некалькі спартсменаў, у якіх высокі гандыкап, так званы ўзровень прафесіяналізму. Пакуль у нас мала жанчын, якія добра гуляюць у гольф, каля 12 чалавек, 30 спартсменаў школьнага ўзросту. Усяго набіраецца каля двухсот чалавек. Вядома, гэта мала. Прывяду прыклад: у Фінляндыі пражывае 4 мільёны чалавек, яны маюць 158 гольф-палёў, і 200 тысяч чалавек займаюцца гэтым найцікавейшым відам спорту.

Каб развівацца хутчэй, мы наладжваем супрацоўніцтва з замежнымі асацыяцыямі, гэта дасць магчымасць у першую чаргу пераняць вопыт калег і паказаць сябе на міжнародных турнірах.

***— Можа, у нас ужо ёсць спартсмены, якія заявілі пра сябе на міжнародным узроўні?***

— У нас ёсць добрыя вынікі. Напрыклад, наша каманда спартсменаў-аматараў заняла першае месца ў розыгрышы міжнароднага турніру па гольфе з колькасцю ўдзельнікаў больш за 150 гульцоў. Гэта быў Кубак прэзідэнта Нацыянальнага алімпійскага камітэта Літоўскай Рэспублікі Дайны Гудзіневічуце, ён прайшоў у маі ў сталічным гольф-клубе пад Вільнюсам. Галоўнае цяпер для асацыяцыі — надаць больш шырокую папулярнасць і масавасць гольфу ў нашай краіне, і поспехі абавязкова прыйдуць.

***— Якія спаборніцтвы па гольфе праходзяць у Беларусі?***

— Сёлета мы адкрылі сезон у маі і адразу правялі майстар-клас для паслоў, потым адбыўся 5-ты кубак Беларусі па гольфе, далей у нас будзе яшчэ адзін майстар-клас для дыпламатаў, акрэдытаваных у Беларусі, міжнародны турнір на прызы пасла Казахстана і другі этап кубка Беларусі, дзе мы падвядзём вынікі ўсяго сезона. Наогул, мы ставім задачу праводзіць 12 турніраў за год.

***— Ну а самі вы ў гольф гуляеце?***

— Па-сапраўднаму я пазнаёміўся з гэтым спортам, калі працаваў паслом Беларусі ў Літве. Там і ўзяў першыя ўрокі. Прафесійным гульцом гольфа я не стаў, але аматарам з'яўляюся.

Дома стварыў міні-гольф-поле, там, праўда, толькі тры лункі. Мы з унукамі кожную раніцу выходзім і спаборнічаем.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*



**ЦІКАВА!**

*Спартыўная гульня, вядомая як гольф, існуе ў сучаснай інтэрпрэтацыі ўжо больш за сто гадоў. Афіцыйныя спаборніцтвы па гольфе праводзяцца ў 56 краінах свету.*

• • •

*Існуе версія, што асновы гэтай гульні былі закладзены яшчэ сярэдневечнымі пастухамі, якія білі па круглых каменьчыках сваімі палкамі, каб не сумаваць падчас выпасу авечак.*

• • •

*У кожнай гульні ўдзельнік павінен прайсці пэўную колькасць лунак (як правіла, 18) у канкрэтным парадку. Для гульні ў гольф можна выкарыстоўваць ад 2 да 14 відаў клюшак. Звычайна адзін матч працягваецца 4-5 гадзін, за гэты час чалавек спальвае ад 750 да 1000 калорый.*

• • •

*Гальфісты павінны прыходзіць у клуб у пэўнай вопратцы. Стаўленне да дрэс-кода на розных палях рознае. Напрыклад, у закрытых прыватных клубах можа быць рэгламентавана даўжыня і расфарбоўка мужчынскіх шкарпэтак, а таксама глыбіня выразу на жаночых блузках.*

• • •

*Хуткасць руху клюшкі для гольфа ў большасці гульцоў — 150 км/г. У славутага Тайгера Вудса — 201 км/г.*



# САКРЭТЫ ЦЫБУЛЬНАГА ЎРАДЖАЮ



**Вось і падыходзіць час уборкі рэпчатай цыбулі. На кухні без яе ніяк — цыбулі шмат не бывае, і запас на зіму патрэбен добры. Толькі вось не заўсёды ён атрымліваецца: хоць і няма асаблівых складанасцяў у вырошчванні гэтай культуры, але агароднікі часта скардзяцца на дрэнны ўраджай. То ўся цыбуля ў стрэлку пайшла, то шкоднікі яе паелі, то дробная атрымалася, то не захоўваецца — гніе ці прарастае...**

## САКРЭТ 1: што саджаць, калі саджаць

Многія спрактыкаваныя агароднікі раяць саджаць толькі самую дробную сеянку (цыбулінкі да 1 см дыяметрам) і толькі пад зіму ці вельмі рана вясной. Чаму так? Прычын некалькі:

• такая цыбуля менш пашкоджваецца цыбульнай мухай — да моманту яе вылету расліны ўжо сілу набіраюць, шкоднікам «не па зубах»;

• такая цыбуля раней паспявае, і ўбраць яе звычайна паспяваеш да зацяжных дажджоў, халодных ранішніх рос і іншых «радасцяў прыроды», якія на захаванасці ўраджаю адбіваюцца.

## САКРЭТ 2: тонкасці догляду

**Рыхленне і праполка**

Самая клапотная — першая праполка, пакуль усходы яшчэ невялікія, а трава расце актыўна. Потым хапае аднаго толькі рыхлення, але рэгулярна. Колькасць і перыядычнасць залежыць ад глебы: чым яна больш шчыльная, тым часцей трэба рыхліць глебу. Пасля дажджу або паліву — вельмі пажадана.

**Паліў**

Паліваць цыбулю пачынаюць, калі зямля ад вясновай вільгаці прасыхае. Да сярэдзіны чэрвеня трэба палівацьрэгулярна, потым — у залежнасці ад надвор'я і стану раслін. Паліў трэба спыняць, калі пачынае спець цыбуліна, інакш лішак вільгаці прывядзе да таго, што захоўвацца ўраджай будзе дрэнна. Бывае, што паўплываць на гэта ніяк немагчыма: калі зарадзілі дажджы на месяц... Што ж зробіш! Але калі на пачатковым этапе, у час актыўнага росту лісця і фарміравання цыбуліны, вільгаці будзе мала, то і ўраджаю добрага не відаць — вырасце цыбулька дробная і смакам асабліва не парадуе.

## САКРЭТ 3: нюансы ўборкі

Вырасціць добрую цыбулю — палова справы; каб яна доўга захоўвалася, вельмі важна своечасова ўбраць і правільна прасушыць.

**Час уборкі**

Як вызначыць, што пара прыйшла? Калі пяро палегла, у цыбуліны з'явілася луска, і яна лёгка здабываецца з градкі — настаў час уборкі. Калі ператрымаць, цыбуля зноў пускае карані (асабліва калі надвор'е дажджлівае). Такі ўраджай будзе дрэнна захоўвацца.

Зручней, вядома, убіраць усю цыбулю ў адзін прыём. Але вось бяда — спець адначасова яна ніяк не хоча. Таму варта выбіраць яе паступова — па меры гатоўнасці. Так што расцягнуцца ўборка ўраджаю можа і на тыдзень, і на 10 дзён. Зразумела, што такі варыянт магчымы толькі ў тым выпадку, калі вы на агародзе бываеце досыць часта, а калі толькі наездамі, то ўбіраць даводзіцца адразу ўсю, калі большая частка цыбулін на градцы паспее.

**Сушка**

Ідэальны варыянт: убіраем цыбулю ў сухое надвор'е і на 2-3 дні пакідаем на сонейку. Яна падсыхае, да таго ж ультрафіялетавыя прамяні абеззаражваюць цыбуліны, што таксама добра адбіваецца на захоўванні. Калі надоўга пакінуць ўраджай на градцы немагчыма, паспрабуйце хоць бы на працягу дня прасушыць яго на вуліцы: вырваць раніцай, раскласці на агародзе і не прыбіраць да вечара, а пасля дасушваць у памяшканні, якое добра праветрываецца.

На гэтым этапе наогул лепш нікуды не спяшацца — чым лепш прасушыць цыбулю, тым даўжэй яна захаваецца. Гатоўнасць вызначаюць па стане шыйкі: калі яна высахла цалкам, цыбулю можна прыбіраць на захоўванне. Цыбуліны з тоўстай шыйкай сохнуць даўжэй, а часам так і не высыхаюць — тады іх лепш адкласці і выкарыстоўваць у першую чаргу: захоўвацца яны ўсё роўна будуць дрэнна.

Што рабіць далей — справа густу. Хтосьці абразае сухое пяро і захоўвае цыбулю ў сетках, панчохах або скрынях. Хтосьці любіць заплятаць косы — і прыгожа, і зручна. Калі нейкая цыбуліна ў касе пачала псавацца або прарастаць, гэта адразу відаць, і выдаліць яе лёгка, пакуль не пацярпелі суседнія. Ну а дробную цыбульку і тую, у якой пяро абарвалася, можна скласці ў сетку для агароднiны і падвесіць побач з косамі.

**Даты | Падзеі | Людзі**

**29 ЛІПЕНЯ**

**1625** год — 390 гадоў таму нарадзіўся (в. Сервач, цяпер Карэліцкі раён) Багуслаў Казімір Маскевіч, беларускі вайсковы і грамадскі дзеяч, пісьменнік-мемуарыст. Адукацыю атрымаў у Наваградку. Служыў пры дварах харунжага Вялікага Княства Літоўскага Багуслава Радзівіла, быў у войску І. Вішнявецкага, з якім у 1647-м пабываў у Запарожскай сечы. У 1650-м пакінуў вайсковую службу. Быў Ашмянскім маршалкам. Аўтар двух дыярыушаў (дзённікаў). Акрамя апісання падзей, якія адбываліся напярэдадні паўстання Багдана Хмяльніцкага, тут шмат партрэтных і пейзажных замалёвак, тонкіх назіранняў, апісанняў з'яў і паводзін людзей ва ўмовах вайны, іх узаемаадносін. Дыярыушы Маскевіча даюць аб'ектыўнае ўяўленне пра тагачасныя падзеі і факты ваеннага, палітычнага і грамадскага жыцця. Памёр у 1683 годзе.

**1828** год — нарадзіўся (Гродзенская губерня) Васіль Паўлавіч Энгельгард, астраном і мецэнат, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890), доктар астраноміі. У 1872-1879 гг. пабудаваў каля г. Дрэздэн (Германія) адну з найлепшых у Еўропе астранамічных абсерваторый. Праводзіў сістэматычныя астранамічныя назіранні камет, малых планет, туманнасцяў і зорных скопішчаў. Склаў каталог больш як 600 туманнасцяў. Яго працы публікаваліся ў вядучых астранамічных часопісах. У 1886-1895 гг. на ўласныя сродкі выдаў матэрыялы сваіх амаль 20-гадовых астранамічных даследаванняў. У 1897 годзе перадаў Казанскаму ўніверсітэту інструменты, абсталяванне і навуковую бібліятэку, што дазволіла пабудаваць каля Казані новую абсерваторыю, якую назвалі імем вучонага. Ён быў выдатным музыкантам (піяніст, арганіст), прапагандаваў творчасць М. Глінкі, шмат аўтографаў якога і партытуру оперы «Іван Сусанін» перадаў у Публічную бібліятэку Пецярбурга. У канцы XIX ст. захапіўся расійскай ваеннай гісторыяй, прайшоў па месцах, звязаных са швейцарскім паходам Суворава (1799). Памёр у 1915 годзе.

**1914** год — адменены VI летнія Алімпійскія гульні, якія, па рашэнні МАК, прынятага 27 мая 1912 года, павінны былі адбыцца ў 1916 годзе. Правы іх правядзення выйграў Берлін, пакінуўшы ззаду іншых прэтэндэнтаў: Александрыю (Егіпет), Амстэрдам (Нідэрланды), Брусель (Бельгія), Будапешт (Аўстра-Венгрыя) і Кліўленд (ЗША). Сталіца Германіі на ўсю моц рыхтавалася да Гульняў, там нават быў пабудаваны новы стадыён. Аднак у сувязі з пачаткам Першай сусветнай вайны Алімпіяду прыйшлося адмяніць. Незадоўга да вайны, у чэрвені 1914-га, на чарговай сесіі МАК у Парыжы было прынята некалькі важных арганізацыйных рашэнняў, якія маюць вялікае значэнне для ўсяго алімпійскага руху. У прыватнасці, на сесіі быў зацверджаны алімпійскі сцяг (з пяццю пераплеценымі кольцамі), афіцыйныя мовы (французская, англійская і нямецкая), таксама ўпершыню было разгледжана пытанне аб прынцыпах ўзаемадзеяння МАК з міжнароднымі федэрацыямі. Трэба адзначыць, што і ў гады вайны, нягледзячы на зрыў чарговых Гульняў, Міжнародны алімпійскі камітэт працягваў сваю працу. Дарэчы, згодна з Алімпійскай хартыяй, за летнімі Алімпіядамі, якія не адбыліся, захоўваюцца іх нумары, таму наступным летнім Гульням 1920 года быў прысвоены нумар «7», і іх вырашана было правесці ў Антверпене (Бельгія). А вось Германія і яе саюзнікі па Першай сусветнай вайне рашэннем МАК былі адхілены ад удзелу ў гэтай Алімпіядзе.




**Было сказана**

**Артур ВОЛЬСКІ, паэт:**
*«Кожны добры позірк — набыццё, а кожны злосны позірк — гэта страта».*

**Азбука народнай культуры**

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

СОЛЬ. Акрамя таго, што соль надае ежы пэўны смак, яна з'яўляецца абавязковым атрыбутам шматлікіх абрадаў. Паўсюдна лічыцца, што нячыстая сіла баіцца солі. У народнай культуры славян соль таксама выконвала ролю надзейнага абярэга.

◈ Жанчыне, якая толькі нарадзіла дзіця, бабка-павітуха націрала соллю лоб, тым самым жадаючы засцерагчы яе ад сурокаў.

◈ З солі рабілі абярэгі для людзей і жывёлы. Напрыклад, для дзіцяці шылі невялікі мяшэчак з чырвонай тканіны і засыпалі ў яго некалькі крупінак чацвярговай солі. Насіць такі абярэг неабходна было на грудзях. Адным са сродкаў лячэння свойскай жывёлы лічылі невялікія жытнёвыя «калабкі», у якія абавязкова замешвалі чацвярговую соль.

◈ На працягу шматлікіх стагоддзяў соль была вельмі каштоўным мінералам, таму да яе ставіліся ашчадна і паважліва. Рассыпаць соль — значыць нанесці сям'і пэўную страту, якая не можа не прывесці да сваркі. Акрамя таго, лічылі, гэта пануе нячыстая сіла і жадае знішчыць надзейны абярэг хаты. Каб адвесці бяду, трэба было некалькі крупінак солі кінуць праз левае плячо.

◈ На працягу года было некалькі дзён, калі можна і неабходна было прыгатаваць рытуальную соль, напрыклад Чысты чацвер. У дзень ушанавання святой Агаты ў цэрквах асвячалі хлеб разам з соллю, якія потым захоўвалі ў хаце як надзейны абярэг ад пажару.

◈ У той жа час у пэўных сітуацыях неабходна было гатаваць ежу без ужывання солі. Не салілі хлеб для жалобнага стала ці ў дні ўшанавання продкаў на Дзяды. З надзеяй на дапамогу продкаў пяклі «праснакі» для свойскай жывёлы на Каляды і Вадохрышча. У дні, калі «задобрывалі» дамавіка, яму гадавалі кашу без солі.

◈ У дачыненні да солі забаранялася браць яе з сальніцы пальцамі; тыцкаць лусту хлеба ў сальніцу. Лічылася, што кідаць соль у агонь — да сваркі.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.18 | 21.16 | 15.58 |
| Віцебск — | 5.02 | 21.11 | 16.09 |
| Магілёў — | 5.07 | 21.04 | 15.57 |
| Гомель — | 5.11 | 20.55 | 15.44 |
| Гродна — | 5.35 | 21.29 | 15.54 |
| Брэст — | 5.42 | 21.23 | 15.41 |

**Месяц**

***Поўня 31 ліпеня. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.** Валянціны, Юліі, Івана, Паўла, Пятра, Фёдара, Якава.*
***К.** Марты, Антона, Канстанціна.*

Фота Надзеі БУЖАН.



## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| ВАРШАВА | КІЕЎ | РЫГА |
|---|---|---|
| +21..+23°С | +23..+25°С | +15..+17°С |
| **ВІЛЬНЮС** | **МАСКВА** | **С.-ПЕЦЯРБУРГ** |
| +18..+20°С | +22..+24°С | +17..+19°С |

**УСМІХНЕМСЯ**

**— Кошка ў дэпрэсіі, парайце спецыяліста.**
**— Падыдзе любы кот.**

Да ўрача ходзяць, каб пачуць, як хвароба называецца, а потым чытаць пра яе ў інтэрнэце.

**— У вас бываюць правалы ў памяці?**
**— Не памятаю такога.**

Нельга адмаўляць сабе любімаму... Захацелася ў Італію — звары макарону!



caricatura.ru

**ЗВЯЗДА** БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.569. Індэкс 63850. Зак. № 2936.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 28 ліпеня 2015 года.